Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ВЕРАСНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 178 (30058)

ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ 3

ДА ЧАГО ПРЫВОДЗЯЦЬ НЯБАЧНЫЯ ТРАЎМЫ

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Аляксандр КАДЛУБАЙ, намеснік міністра адукацыі:**

*«Ва ўсіх установах адукацыі 15 верасня пройдзе Адзіны ўрок памяці, прысвечаны Дню народнага адзінства. Метадычныя рэкамендацыі па яго правядзенні накіраваныя ва ўстановы адукацыі, у іх распісаная спецыфіка правядзення гэтых заняткаў у залежнасці ад узросту навучэнцаў, каб было разуменне ў педагогаў, як дадзеную тэму правільна раскрыць, якія гістарычныя факты ў якой паслядоўнасці выкласці, як падвесці навучэнцаў да важных пытанняў, даць на іх адказы. Дзякуючы гэтаму мы сфарміруем у дзяцей правільнае разуменне важнасці надыходзячага свята, важнасці яго не толькі з пункту гледжання гісторыі, але і сучаснасці. Мы выдатна разумеем і дзецям павінны данесці, што калі б не тая ключавая дата — 17 верасня 1939 года, то сёння не было б суверэннай Беларусі. Гэта дата справядлівага ўз'яднання беларускага народа».*

## КАРАТКА

- **Раман Галоўчанка: прапанавана стварыць пры Саўміне Савет па біялагічнай бяспецы.**
- Беларусь і Расія перавялі на лічбавыя тэхналогіі практычна ўсе грузавыя чыгуначныя перавозкі.
- **Салігорск прыме абласны фестываль-кірмаш «Дажынкі».**
- Цэнтр азербайджанскай мовы і культуры адкрыўся ў МДЛУ.
- Веладарожная сетка Гомельскай вобласці сёлета прырасце на 8,5 км.

# Будзем з бульбай



Фота БелТА.

**У Іўеўскім раёне на ўборцы бульбы шчыруюць тры сельскагаспадарчыя студатрады, у якіх задзейнічаны 80 чалавек. Маладыя людзі працуюць з 9 да 13 гадзін, пасля чаго яны абедаюць і адпраўляюцца на вучобу. З пачатку года на Іўеўшчыне адпрацавалі 19 студэнцкіх атрадаў, у іх складзе — 210 чалавек.**

Прэм'ера

## ЯК ПАКАЖУЦЬ МІНУЛАЕ Ў КІНАСТУЖЦЫ «НА ДРУГІМ БЕРАЗЕ»

### Хто здолее змяніць гісторыю ці зменіцца пад яе ўплывам?

**Напярэдадні Дня народнага адзінства Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» прадставіць гледачам прэм'еру — фільм «На другім беразе». Старт кінапракату будзе дадзены сёння ў Мінску і ў кінатэатрах па ўсёй краіне.** СТАР. 4

Выпрабавана на сабе

## ЖУРНАЛІСТЫ ПА ФОРМЕ

### Карэспандэнт «Звязды» перадае з вучэнняў «Ваенкар-2023»

**На палігоне «Лосвіда», што на Віцебшчыне, праходзіць тактыка-спецыяльнае вучэнне з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі «Ваенкар — 2023». Яно праводзіцца на працягу трох гадоў. За гэты перыяд падрыхтоўку прайшло каля 70 журналістаў і блогераў. Сёлета вырашыў паўдзельнічаць у вучэнні і карэспандэнт «Звязды».**

Фота Данііла ХМЯЛЬНІЦКАГА.

Да месца правядзення вучэння ўдзельнікаў даставілі на верталётах ваенна-транспартнай авіяцыі. Гэта сапраўды незабыўнае адчуванне — ляцець высока ў небе, што аж займае дух і закладвае вушы. Цяпер мы, прадстаўнікі СМІ, жывём у палатачным лагеры ў адпаведнасці з вайсковым распарадкам дня. Нашым навучаннем займаюцца найлепшыя інструктары міратворчай роты 103-й асобнай паветрана-дэсантнай брыгады. Па памеры, але пакуль яшчэ не зусім звыкла, прыйшлася ваенная форма і экіпіроўка. СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

Міжнародны вектар

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «У БЕЛАРУСКА-ІРАНСКАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА ВЯЛІКАЯ БУДУЧЫНЯ»

**Падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь Алірэзай Санеі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што Беларусь заўсёды гатовая падтрымаць гэтую краіну як у супрацоўніцтве, так і на ўсіх міжнародных пляцоўках і арганізацыях.**

«Такія дружалюбныя адносіны паміж нашымі краінамі склаліся дзякуючы, вядома, тым добрым, канструктыўным адносінам, якія ёсць паміж прэзідэнтамі нашых краін, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. — Наш Прэзідэнт быў не аднойчы ў Іране. Гэта сведчанне таго, што ў нашых краін вялікая будучыня і мы накіраваныя на канструктыўнае супрацоўніцтва. У сакавіку 2023 года Аляксандр Рыгоравіч у чарговы раз наведваў Іран, дзе даў высокую ацэнку нашаму супрацоўніцтву. Узаемадзейнічаюць нашы ўрады, рыхтуюцца ўзаемныя візіты прэм'ер-міністраў нашых краін».

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на супрацоўніцтве дзвюх краін у эканоміцы. «Мы з вамі — як Беларусь, так і Іран — жывём у часы санкцый, — удакладніла спікер. — І падтрымка адзін аднаго для нас вельмі важная. Для нас, мы дакладна разумеем, гэта тая сітуацыя, у якой можна спакойна жыць, і не проста жыць, а развівацца. Гэта акно магчымасцяў, і таму цяпер наша краіна актыўна працуе па ўсіх кірунках для таго, каб наш народ не адчуў на сабе санкцыйнага ўздзеяння. Эканоміка расце, прадпрыемствы працуюць і таму для нас той узровень тавараабароту, які склаўся, — $100 млн, мы разумеем, што гэта не мяжа для нашага супрацоўніцтва».

Міжпарламенцкае ўзаемадзеянне Беларусі і Ірана развіваецца вельмі плённа, заявіла Наталля Качанава. «Працуюць групы дружбы, якія актыўна супрацоўнічаюць не толькі ў рамках узаемных візітаў, але і праводзячы мерапрыемствы ў рэжыме анлайн. Таму наша ўзаемадзеянне павінна працягвацца менавіта ў такім рэчышчы», — сказала яна.

У цяперашняй сітуацыі ў свеце роля парламентарыяў узрастае кратна, адзначыла спікер. «Беларусь — міралюбная краіна. Ад нас ніколі не зыходзіла і не будзе зыходзіць агрэсія, таму што мы вельмі глыбока разумеем цану міру, ведаем, што такое вайна. Мы павінны рабіць усё для таго, каб данесці праўду аб нашай краіне, аб нашых узаемаадносінах. І вядома, гэта ключавое, на што сёння павінна быць нацэлена ўвага ўсіх парламентарыяў. Для таго каб захаваць мір і спакой», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Яна выказала ўпэўненасць, што пасол пабывае на беларускіх прадпрыемствах, у рэгіёнах, азнаёміцца з прадукцыяй беларускай вытворчасці. «Мы адназначна знойдзем новыя пункты ўзаемадзеяння ў эканоміцы нашых краін», — рэзюмавала спікер.

Разам

# Захапленне краінай на розных мовах

## выказалі прадстаўнікі нацыянальных абшчын, якія ўчора наведалі Палац Незалежнасці

**Напярэдадні Дня народнага адзінства Палац Незалежнасці па традыцыі гасцінна расчыніў дзверы для наведвальнікаў. Гонар наведаць сімвал беларускай дзяржаўнасці выпаў прадстаўнікам нацыянальных абшчын, якія прыйшлі з нагоды маючага адбыцца свята ў нацыянальных касцюмах.**

Так ярка і шыкоўна ў Палацы, здаецца, дагэтуль не было. І адначасова так прыгожа — разам з нацыянальнымі аб'яднаннямі на экскурсіі пабывалі прадстаўніцы Беларускага саюза жанчын з усіх рэгіёнаў краіны. Больш за тое, многія з іх былі аўтарамі карцін, выстаўка якіх адкрылася ў Палацы Незалежнасці. А вось сюрпрызам ад Палаца стаў новы ўнікальны экспанат — шкатулка 1939 года, падарунак Уладзіміра Пуціна Прэзідэнту Беларусі падчас наведвання музея ваенна-марской славы ў Кранштаце, які раней не выстаўляўся. У хуткім часе ён таксама зойме сваё месца ў музеі ўстановы.

Ідэю прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў (азербайджанцаў, армян, афганцаў, башкіраў, грузін, дагестанцаў, яўрэяў, казахаў, карэйцаў, малдаван, немцаў, палякаў, рускіх, татараў, туркменаў, украінцаў, цыган, чувашоў, эстонцаў) наведаць Палац Незалежнасці падтрымаў Кансультатыўны міжэтнічны савет пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў дзяліліся ўражаннямі ад пачутага і ўбачанага, шмат фатаграфаваліся і нават чыталі вершы па-беларуску. І сыходзіліся на адным: у Беларусі яны жывуць у міры і згодзе дзякуючы міралюбнай палітыцы нашай дзяржавы, а таксама гасціннасці і адкрытасці беларусаў.

**Хізры АСАДУЛАЕЎ, кіраўнік Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Горо» (Дагестан)** адзначыў, што Палац Незалежнасці — сэрца краіны, і пабываць у такім знакавым месцы — вялікі гонар.

— Беларусь — гэта райскі куток. Таму я заўсёды называю яе тэрыторыяй міру і любові. А людзі тут добразычлівыя, гасцінныя і спагадлівыя. Беларусы ўмеюць сябраваць, а для горца гэта вельмі каштоўна, — адзначыў Хізры Асадулаеў.

**Аляксандр СОНГІН, старшыня Саюза палякаў на Беларусі, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў,** адзначыў, што ў Беларусі любы чалавек можа свабодна жыць і працаваць, і беларускія палякі лічаць сябе найперш грамадзянамі Беларусі.

— З пачуццём глыбокай павагі прысутнічаем тут, і мы, беларускія палякі, заўсёды лічым сябе найперш грамадзянамі Беларусі. Заўсёды прытрымліваліся і будзем прытрымлівацца гэтай пазіцыі.

**Уладзіслаў КАДЗІРА, старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Ватра»,** жыве ў нашай краіне 22 гады. І ўпэўнены, што ў Беларусі створаны ўсе ўмовы для камфортнага жыцця:

— У Беларусі жывуць прадстаўнікі больш як 156 нацыянальнасцяў, і нягледзячы на тое што мы розныя па менталітэце, мы адзіныя. Бо Беларусь — краіна, якая дае ўсе ўмовы для камфортнага жыцця. Дзяржаўная палітыка накіраваная на тое, каб дапамагчы ўсім прыезджым, хто хоча прысвяціць сваё жыццё Беларусі.

Прадстаўніцы Беларускага саюза жанчын прыехалі ў сталіцу з розных куткоў Беларусі. Гэта жанчыны самых розных прафесій — ад настаўнікаў і ўрачоў да работніц гаспадарак і прадпрыемстваў. Той факт, што іх аматарскія карціны выстаўленыя ў будынку, які з'яўляецца сімвалам нашай дзяржаўнасці, выклікаў у іх самыя розныя праявы яркіх эмоцый — ад воклічаў захаплення да слёз.

**Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ, старшыня Беларускага саюза жанчын** расказала, што праект «Яе рук справа», які распачаўся год таму, 17 верасня 2022-га, завяршаецца адкрыццём выстаўкі ў Палацы Незалежнасці. Тут прадстаўленыя работы з усёй краіны, а іх аўтаркі — не прафесійныя мастачкі, а аматаркі. Усе ўдзельніцы падарылі свае карціны, і пасля заканчэння выстаўкі тыя будуць прададзеныя на аўкцыёне. Прычым жанчыны самі вырашаць, на якую дабрачынную справу будуць накіраваны выручаныя сродкі.

— Мне здаецца, у гэтым і ёсць адзінства нашых жанчын, нашых душ, сэрцаў, і для кожнай з іх вельмі важна ўбачыць сваю работу ў Палацы Незалежнасці. Яны малявалі іх дома, і ніхто не ўяўляў, што ў іх будзе такая выстаўка, — падзялілася Вольга Шпілеўская.

**Валянціна ЗАЯЦ, пенсіянерка з Барысава,** вышывала сваю карціну восем месяцаў:

— Калі ўбачыла сваю работу на такой выстаўцы, у мяне на вачах з'явіліся слёзы. Гэта ўзровень і, напэўна, прызнанне, бо звычайна я рабіла нешта для сябе і блізкіх, — расказала жанчына.

**Вікторыя НОВІКАВА, педагог дадатковай адукацыі цэнтра творчасці дзяцей і моладзі з Хойнікаў,** сваю работу выканала з дапамогай кавы:

— Такую тэхніку, а карціна робіцца з выкарыстаннем кавы і драўняных апілак, я прыдумала нядаўна. У мяне неверагодныя адчуванні наконт таго, што яна аказалася ў Палацы Незалежнасці. Гэта касмічна, і я атрымала натхненне для сваіх будучых карцін.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ГІСТОРЫЮ ТРЭБА ВЕДАЦЬ

## Выстаўка да Дня народнага адзінства адкрылася ў Мінску

**Экспазіцыю складае падборка плакатаў, фатаграфій і газет, якія апавядаюць пра падзеі верасня — лістапада 1939 года: вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, станаўленне савецкай улады на вызваленай тэрыторыі і заканадаўчае замацаванне ўз'яднання Заходняй Беларусі з Беларускай ССР. Таксама ў экспазіцыі адлюстравана інфармацыя пра вядомых грамадска-палітычных дзеячаў таго часу, паведаміла БелТА.**

У адкрыцці выстаўкі ўзялі ўдзел **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар СЕРГЕЕНКА, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр ХРАМОЙ,** а таксама супрацоўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Праект падрыхтаваны пры садзейнічанні Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, **лаўрэата прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», аўтара праекта «Бацькаўшчына» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.**

Як звярнуў увагу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, 1939 год — гэта радасць уз'яднання. «Выстаўка ў думках пераносіць нас у тыя падзеі даваеннага часу, — адзначыў ён. — Сваю гісторыю трэба ведаць. І я бачу, што цікавасць да нашай гісторыі ўзрастае апошнія гады, прычым не толькі сярод моладзі».

Уладзімір Ліхадзедаў у гутарцы з журналістамі падкрэсліў, што Дзень народнага адзінства для яго ў ліку галоўных дзяржаўных свят. «Самае важнае — мір, — перакананы ён. — Сапраўды, хто б што ні казаў, як бы ні ставіўся, але дзякуючы нашаму Прэзідэнту, яго палітыцы ў нас мір».

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Варшаве пройдзе «марш гневу супраць канцылярыі прэм'ер-міністра»

Тысячы польскіх бюджэтнікаў 15 верасня выйдуць у Варшаве на «марш гневу супраць канцылярыі прэм'ер-міністра» з патрабаваннем павышэння зарплаты, паведаміла газета Wyborcza. Адзначаецца, што прафсаюзныя актывісты збяруцца апоўдні на плошчы Дэфілад, адкуль яны накіруюцца да канцылярыі прэм'ер-міністра Польшчы. Ва Усепольскім саюзе прафсаюзаў заявілі, што чакаюць удзелу ў маніфестацыі каля 3-4 тысяч чалавек з усёй Польшчы. Як паведаміў партал money.pl, пра свой удзел у маршы ўжо заявілі супрацоўнікі пракуратуры, судоў, пажарных камандаў і паліцыі, кіроўцы гарадскіх аўтобусаў, настаўнікі, супрацоўнікі ўпраўлення сацыяльнага страхавання і Нацыянальнай інспекцыі працы, а таксама чыноўнікі з органаў мясцовага самакіравання. «Марш гневу супраць канцылярыі прэм'ер-міністра» — гэта пярэчанне супраць палітыкі, якую ўрад праводзіць у дачыненні да пераважнай большасці работнікаў дзяржбюджэтнай сферы», — прыводзіць словы старшыні Форуму прафсаюзаў Польшчы Дароты Гардыяс выданне Business Insider.

### Губернатар штата Джорджыя абвясціў надзвычайнае становішча з-за высокай інфляцыі

Кіраўнік амерыканскага штата Джорджыя Браян Кэмп абвясціў надзвычайнае становішча з-за высокай інфляцыі, абвінаваціўшы ў гэтым палітыку адміністрацыі Белага дома, паведаміла ABC News. У прэс-рэлізе офіса губернатара адзначаецца, што ў штаце часова адмяняецца акцызны падатак (падаткі, што спаганяюцца з пэўных тавараў, паслуг і відаў дзейнасці) на маторнае і лакаматыўнае паліва. «Хоць высокія цэны працягваюць біць па сямейных бюджэтах, працавітыя жыхары Джорджыі заслугоўваюць сапраўднага палягчэння, і менавіта таму я падпісаў указ аб прыпыненні акцызнага падатку», — заявіў Браян Кэмп. Ён дадаў, што яго адміністрацыя будзе працаваць з генеральнай асамблеяй штата, «каб дапамагчы жыхарам Джорджыі пераадолець эканамічныя цяжкасці, справакаваныя палітыкай Джо Байдэна, яго адміністрацыяй і іх саюзнікамі ў Кангрэсе». Губернатар заявіў, што жыхары змогуць сэканоміць «31,2 цэнта за галон (3,7 літра) бензіну і 35 цэнтаў за галон дызельнага паліва» ва ўмовах надзвычайнага становішча. Абвешчана, што ўказ будзе дзейнічаць да 12 кастрычніка.

### У супермаркетах Вялікабрытаніі з'явіліся муляжы прадуктаў з-за «эпідэміі крамных крадзяжоў»

Пакупнікі бяруць з вітрын пустыя скрынкі-муляжы і абменьваюць іх на касе на сапраўдныя прадукты, піша брытанская газета Daily Mail. Прычым гэта датычыцца такіх танных тавараў, як шакаладныя цукеркі, кава, кетчуп. Daily Mail адзначае, што на пустых скрынках з-пад цукерак можна ўбачыць лагатып фірмы-вытворцы і налепку з надпісам: «Супрацькрадзежны ўзор». Фіктыўная ўпакоўка выкарыстоўваецца ў крамах з павышанай рызыкай. Акрамя таго, для абароны тавараў з больш высокім коштам прымяняюцца нацельныя камеры для ахоўнікаў і GPS-адсочванне.

Напярэдадні

# МОЦНЫЯ, КАЛІ АДЗІНЫЯ

**На Магілёўшчыне кожны дзень перадсвяточнага тыдня напоўнены цікавымі падзеямі і сустрэчамі. Флэшмобы, дыскусійныя пляцоўкі, выставы, канцэрты — кожны раён вобласці прапануе свае варыянты святкавання.**

Для студэнтаў МДУ імя А. Куляшова вельмі пазнавальнай была прэс-канферэнцыя з удзелам прадстаўнікоў кіраўніцтва ВНУ, абласной улады, інстытута рэгіянальнага развіцця. **Прарэктар МДУ імя А. Куляшова Дзмітрый РАГАЎЦОЎ** нагадаў, што свята з'явілася невыпадкова. На прыкладзе гістарычных падзей ён раскрыў наступствы Рыжскага міру, які быў заключаны паміж СССР і Польшчай у 1921 годзе. Па яго выніках заходнія тэрыторыі Беларусі і Украіны перайшлі да заходняга суседа.

— Палякі не мелі ілюзій у дачыненні да мясцовага насельніцтва, якое перажывае ў заходніх абласцях Беларусі, — удакладніў прамоўца. — Ставілася задача правядзення паланізацыі, беларусы пазбаўляліся права размаўляць і атрымліваць адукацыю на сваёй мове. Прымаліся рэпрэсіўныя меры.

Дзмітрый Рагаўцоў адзначыў, што амаль дзесяць тысяч нязгодных з такой пазіцыяй беларусаў аб'ядналі партызанскі рух. Для ўціхамірвання найбольш актыўных супраціўленцаў на Брэстчыне быў створаны канцлагер Бяроза-Картузская. Адбывалася жорсткая ў адносінах да праваслаўных этнаканфесіянальная палітыка. Каталіцкая царква прымусова пераводзіла людзей у каталіцтва.

— Рашэнне аб падзеле народа прымалася без яго законных прадстаўнікоў, — звярнуў увагу прарэктар. — І гэта яшчэ раз падкрэслівае важнасць таго, што сёння існуе Рэспубліка Беларусь і мы з'яўляемся паўнавартасным суб'ектам міжнародных адносін. 17 верасня 1939 года краіна ўз'ядналася — сотні тысяч людзей вярнуліся ў сваю дзяржаву.

Сёння асабліва выразна відаць, як дрэнна і нават трагічна складваецца лёс асобных дзяржаў, калі народ раз'ядноўваюць. Калі пачынаецца падзел па моўнай прыкмеце, канфесіянальнай, паводле прыналежнасці да канкрэтных палітычных аб'яднанняў, гэта да дабра не прыводзіць.

Тэма адзінства стане на Магілёўшчыне галоўнай падчас урачыстай «Вахты Памяці», якая адбудзецца на плошчы Славы ў пятніцу. Па ўсім рэгіёне запланавана шмат спартыўных і культурна-забаўляльных мерапрыемстваў. Асабліва насычаная праграма 17 верасня. У гэты дзень пройдуць конкурсы, міні-фестывалі, сямейныя святы. У парку Падміколле адбудзецца забег адзінства. Спорт, як вядома, яднае і гуртуе. На плошчы Адзінства па вуліцы Першамайскай у другой палове дня будуць працаваць гандлёвыя рады, выстава-продаж з магчымасцю паўдзельнічаць у майстар-класах, галерэя пад адкрытым небам: «Мой Магілёў — адзінства вобразаў скрозь час». У праграме выступленне заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля танца. У гэты ж дзень дэлегацыя Магілёўскай вобласці ў колькасці чатырохсот чалавек будзе прысутнічаць на вялікім мерапрыемстве з удзелам кіраўніка дзяржавы на «Мінск-Арэне».

**Начальнік управаўлення ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Наталля ДАШКОВА** звярнула ўвагу на тое, што ў рамках праекта «Беларусь — 17 граняў адзінства» на Магілёўшчыне пройдуць дыялогавыя пляцоўкі, круглыя сталы з удзелам дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, актывістаў БРСМ, іншых грамадскіх арганізацый.

Цікавым мерапрыемствам стала канферэнцыя па ўдасканаленні архіўнай даследчай работы, дзе былі абмеркаваныя пытанні захавання памяці ахвяр, якія загінулі пры абароне Айчыны, перспектывы дзейнасці рэгіянальных рабочых груп па ўвекавечанні памяці. Яна прайшла на базе Магілёўскага абласнога інстытута развіцця адукацыі. У Беларуска-Расійскім універсітэце прымалі грамадска-палітычную рэспубліканскую акцыю «Беларусь адзіная».

Вялікае абласное мерапрыемства, прысвечанае Дню народнага адзінства, адбудзецца 15 верасня. Удзел у ім возьмуць дэлегацыі з усіх раёнаў Магілёўшчыны. На ім будуць узнагароджаны актывісты, якія ўнеслі значны ўклад у рэалізацыю патрыятычных ініцыятыў і прасоўванне ідэй беларускай дзяржавы. У суботу педагогі з усяго рэгіёна возьмуць у Магілёве ўдзел у дыялогавай пляцоўцы, якая пройдзе ў абласным інстытуце развіцця адукацыі. Як распавёў **рэктар установы Міхаіл ЖУДРО,** менавіта педагогі стаяць каля вытокаў фарміравання грамадскай пазіцыі падрастаючага пакалення.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

Па сутнасці

# КОД АДЗІНСТВА

**Цягнік імчыць наперад. Нібыта той вірлівы час. Праз акно прабіваюцца промні сонца. Памятаеце, як некалі нашы літаратурныя сейбіты марылі і верылі: «загляне сонца і ў наша ваконца»? Заглянула. Дык яшчэ і ярка свеціць. Не замінае гэтаму харastву парахавы дым, не засцілаюць яснае неба над галовамі беларусаў чорныя хмары вайны. Досыць. Нацярпеліся. Жаданне міру — тое, што нас аб'ядноўвае.**

17 верасня. Дата. Падзея. Гістарычная вяха для нашага народа. Вяртанне адзін да аднаго. І тое было не толькі вызваленне ад польскай акупацыі. Ад пагардлівага звароту «хам», ад сутарэнняў «Бярозы-Картузскай». Польскія асаднікі планава знішчалі аўтахтоннае насельніцтва. «Асвойвалі» жыццёвую прастору. І, дарэчы, не першы раз.

17 верасня — гэта ментальная дата. Аб'яднанне беларусаў. Не толькі пасля польскага прыгону. Варта разумець, што парваная, нібыта сялянская світка, на два лапікі беларуская нацыя была суцэльнай. Таму, аб'яднаная за два гады, яна змагла стаць маналітам. Нібыта той Брэсцкай крэпасцю. Ці не гэта сведчыць аб нашай ужо тады самадастатковасці? Код адзінства — у побыце нашых продкаў. Як бы ні намагаліся пашкодзіць паны — не атрымалася. Гэта не вырвеш. Хіба разам з сэрцам.

Код адзінства — у павазе да продкаў і старэйшых. Таму беларусы заўжды адзначалі Радаўніцу і Дзяды. Ён у павазе да роднай зямлі ў розных вызначэннях. Як ралля і як агульная наша тэрыторыя. Код адзінства — у любові да працы. Таму што Каляды, Юр'я, Купалле, Багач — не толькі адпачынак, але і клопат аб ураджаі. На яго былі накіраваныя нават дзіцячыя гульні.

Павага да працы і чысціні сталі візітоўкай дзяржавы. Чыстыя вуліцы і ладныя сядзібы — таксама тое, што нас аб'ядноўвае. Наш сімвал — арала. Меч — ужо вымушаны крок. Калі баранілі свае палеткі. Вялікая Перамога, якая мала ў якога народа ёсць, — сімвал і сэнс адзінства. А яшчэ зусім не святочная акалічнасць — талакой адказваць бядзе. Нацысцкай, чарнобыльскай. І «менеджары» плана «ОСТ», і эксперты па радыяцыі — ставілі несуцяшальны дыягназ: не будзе іх. Знікнуць. З палітычнай карты, з гісторыі ўвогуле. І колькі ж такіх прадказальнікаў было. Плявузгаюць і сучасныя калабаранты. Усё дарэмна. Не знішчыць нас, не спаліць! Нават на попеле ўзыходзілі новыя парасткі Радзімы. Бо мы ўсе былі разам. Грамадой сустракаем выпрабаванні, грамадой святкуем. У адзінстве наша сіла.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

Прыёмная кампанія — 2023

# Фармат мэтавага набору плануецца захаваць

**У Міністэрстве адукацыі адбылася нарада ў пашыраным складзе па пытаннях удасканалення арганізацыі выніковай атэстацыі выпускнікоў установ агульнай сярэдняй адукацыі і ўступнай кампаніі ва ўстановы вышэйшай адукацыі.**


Фота Лізаветы ГОЛАД.

У ёй узялі ўдзел намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі, намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Ірына Старавойтава, старшыня ЦВК Ігар Карпенка, намеснікі кіраўнікоў аблвыканкамаў, кіраўнікі рэгіянальных упраўленняў адукацыі, рэктары ўстаноў вышэйшай адукацыі, прадстаўнікі педагагічнай грамадскасці.

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы быў прааналізаваны ход выпускных экзаменаў і ўступнай кампаніі. Ставілася задача ўбачыць абітурыента, аб'ектыўна і празрыста ацаніць яго веды. Міністр адукацыі Андрэй Іванец падрабязна спыніўся на выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы: што было зроблена і як справіліся з пастаўленай задачай. Асаблівая ўвага была ўдзелена выяўленню адораных і матываваных абітурыентаў і стварэнню дадатковых магчымасцяў для іх паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі нашай краіны.

Навацыі сёлетняй уступнай кампаніі пачаліся з правядзення ўніверсітэцкіх алімпіяд. У лютым-сакавіку прайшлі ўніверсітэцкія і рэспубліканскія этапы прадметных алімпіяд, пераможцы якіх атрымалі права на залічэнне ў ВНУ без уступных выпрабаванняў.

Больш за чатыры тысячы выпускнікоў школ і каледжаў паступілі сёлета ў ВНУ без уступных іспытаў. Увогуле прадметным камісіям удалося «ўбачыць» каля 17 тысяч абітурыентаў, якія сталі студэнтамі па выніках унутраных экзаменаў.

Упершыню ў краіне праводзіліся цэнтралізаваныя экзамены для выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Пасля падвядзення вынікаў выпускных экзаменаў, абмеркавання іх з педагагічнай і бацькоўскай грамадскасцю адзначаны ў цэлым станоўчы фармат ЦЭ і скарэкціраваныя даты іх правядзення ў 2024 годзе. Прапануецца правесці цэнтралізаваныя экзамены ў панядзелак 27 мая па прадмеце на выбар і ў чацвер 30 мая — па рускай ці беларускай мовах.

Залічэнне на мэтавую форму падрыхтоўкі таксама прайшло ў новым фармаце. Для «мэтавых» абітурыентаў быў распрацаваны асаблівы парадак прыёму. Замест ЦТ яны здавалі толькі адзін іспыт па профільным прадмеце ў вуснай форме прыёмнай камісіі, створанай у ВНУ. Змяніліся і тэрміны падачы дакументаў: мэтавікі рабілі тое раней за ўсіх і здавалі ўступныя іспыты таксама раней. Этапы ўступнай кампаніі былі спланаваныя так, што тыя маладыя людзі, якія не прайшлі на мэтавыя месцы, змаглі ўдзельнічаць у агульным конкурсе, паступіўшы на бюджэтную ці платную форму навучання. Такім чынам шанцы на паступленне можна было павялічыць удвая.

Фармат арганізацыі мэтавага набору ў 2024 годзе плануецца захаваць без змен: будзе праводзіцца ўнутраны ўступны іспыт у ВНУ, а ў склад прадметных камісій будуць уключацца педагагічныя работнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

На нарадзе таксама ўсебакова абмеркавалі і іншыя пытанні падагульняючай атэстацыі школьнікаў, уступнай кампаніі ў ВНУ і вызначылі напрамкі іх удасканалення налета.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Падзея

# Дыялогавая пляцоўка каля Случы

**Гомельская вобласць сустрэла рэспубліканскую акцыю «Сімвал адзінства — 2023»**

Абласны этап праекта, які праводзіцца пад эгідай рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі», прайшоў у Жыткавіцкім раёне. У рамках мерапрыемства адбыліся мітынг, адкрыццё памятнага знака, прысвечанага Дню народнага адзінства, закладка сквера. Акцыя працягнулася на дыялогавай пляцоўцы каля ракі Случ, па якой праходзіла беларуска-польская граніца да 1939 года.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні намесніку міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Назаруку Ігару Васілевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# ЯК ПАКАЖУЦЬ МІНУЛАЕ Ў КІНАСТУЖЦЫ «НА ДРУГІМ БЕРАЗЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У аснову сцэнарыя лёг гістарычны пласт, у дадзеным выпадку гэта 1925 год. Але ў аснове фільма стаіць не палітычная тэматыка, а тое, як проста па жывому разрэзалі краіну пасля Рыжскага дагавору. І многія сем'і апынуліся па розныя бакі ў новай рэальнасці. Частка ў БССР, а іншая ў Заходняй Беларусі. У фільме нам хацелася, у прыватнасці, аўтару сцэнарыя Івану Крываручку (ён сам рэжысёр і мае гістарычную адукацыю) паказаць станаўленне асобы, узаемаадносіны паміж людзьмі. Таму што, як той казаў, як няма ладу, то няма і складу. Калі людзі паміж сабой пачынаюць жыць як звяры, то краіны проста не будзе, —дзеліцца **выканаўчы прадзюсар карціны Ірына ФІЛІПАВА.** — Вобразы ў нас усе зборныя. А гістарычныя факты, якія адлюстроўваем, хоць і мелі права на існаванне, але і яны абагульняючыя. Таму што з заключэннем Рыжскага дагавора пачалася тая гісторыя, калі палілі хутары з боку Польшчы, якія знаходзіліся блізка да граніцы, каб абмежаваць зносіны паміж людзьмі, закрывалі цэрквы, ператвараючы іх у склады. У гістарычных даведках мы чыталі пра выпадкі, калі драўляныя храмы проста спальвалі. Адкрыццё школы на баку БССР — таксама факт, калі ў 1925 годзе была адкрыта адна са школ у Мінску...

Рэжысёрам карціны выступіў Андрэй Хрулёў, вядомы прыхільнікам кіно па такіх работах як «Ідэальнае забойства», «Родныя рукі», «Цягнік лёсу», «Паэтычная драма ў гарадскім садзе»... Над сцэнарыем да кінагісторыі працаваў Іван Крываручка, а вось аператарам кінастужкі стаў Вячаслаў Дунаеў. Музыкальнае аздабленне з'явілася з-пад рукі Аляксандра Сухарава. У акцёрскім складзе заяўлены як расійскія, так і беларускія артысты, сярод якіх Данііл Чуп, Антаніна Дзівіна, Іван Багатыроў, Руслан Чарнецкі, Андрэй Дудко, Алег Коц і многія іншыя. Напярэдадні прэм'еры фільма ў пэўнай часткі аўдыторыі ўзнікаюць пытанні адносна выбару рэжысёра карціны і выканаўцаў галоўных роляў.

— Тое, што ў фільме задзейнічаныя расійскі рэжысёр і акцёры, — гісторыя невыпадковая. Напрыклад, два месяцы паралельна з падрыхтоўкай да здымак мы шукалі выканаўцу галоўнай ролі. Каля двухсот кандыдатур агледзелі. Аднак герой у нас вельмі малады па сцэнарыі, таму патрэбна было знайсці спалучэнне ў чалавеку прафесійнага вопыту і ўзросту. Праглядалі шмат студэнтаў, але не было патрэбнага трапляння ў ролю. Потым ужо прасілі дапамагчы расійскіх калег. Так і склалася, што галоўнага героя ў нас увасабляе ў фільме расійскі акцёр. А вось роля яго сябра ў кадры дасталася беларусу Андрэю Дудко, — тлумачыць Ірына Іванаўна. — Калі казаць пра рэжысёра, то спачатку планавалася, што дадзеную карціну будзе здымаць наш сцэнарыст Іван Крываручка, які працуе як рэжысёр і гісторык, але пад уплывам форс-мажорных абставін давялося шукаць іншую кандыдатуру. Нашы беларускія калегі аказаліся занятыя хто на здымках, хто на мантажы, а для прыняцця рашэння ў нас быў літаральна тыдзень. Так з трох кандыдатур выбралі Андрэя Хрулёва. І ніхто пра тое не пашкадаваў, бо нам вельмі пашчасціла з рэжысёрам.

Здымалі гістарычную драму на шэрагу лакацый, якія ў карціне будуць пададзены ў нязвыклым выглядзе. Так, напрыклад, вобраз той самай ракі, што раздзяліла краіну і людзей, увасабляюць эпізоды, здымкі якіх праходзілі на трох рэчках — Нёмане, Іслачы і Заранцы. Таксама ў новай падачы гледачы змогуць убачыць Заслаўль, Лошыцкі парк, Ракаў і іншыя мясціны, дзе сцэнарый набываў сваё кінагучанне.

— Убачым у эпізодах музей гісторыі быту ў Азярцы і Лошыцкую сядзібу ў абсалютна нечаканых ракурсах, — распавядае мая суразмоўніца. — Слаўны гарадок Гальшаны, які ўвасобіў некаторыя ідэі нашых стваральнікаў, таму што там змаглі знайсці некранутую гісторыю. Сноўская сядзіба, дзе мы здымалі суд. І вядома, выкарыстоўвалі натурпляцоўку кінастудыі «Беларусьфільм».

А калі звернемся да зместу, то папярэдне вядома, што фільм распавядае пра жыццё ў Заходняй Беларусі на мяжы з БССР у 1925 годзе. Тады па волі лёсу частка нашых тэрыторый пасля Рыжскага мірнага дагавору перайшла да Польшчы. У цэнтры кінастужкі — малады хлопец Павел Смоліч са сваёй маці. Ён назірае за тым, як польская ўлада імкнецца асіміляваць мясцовых жыхароў, фактычна забараніўшы іх веру, мову і культуру. Як вынік — хваляванні, партызанскае супрацьстаянне, з іншага боку, жорсткае падаўленне любых спроб захаваць нацыянальную ідэнтычнасць. Разам з галоўным героем гледачы змогуць пражыць самыя розныя падзеі і пачуцці. На экране нас чакаюць і страта блізкіх, і расчараванне, а пасля вяртанне веры ў справядлівасць, пераасэнсаванне важных і галоўных рэчаў, а таксама трансфармацыя пад уплывам гісторыі каханя, якое здараецца незалежна ад абставін. Галоўны герой спачатку нейтральна ставіцца да ўсяго, што адбываецца вакол, у адрозненне ад свайго старэйшага брата Антона, які пайшоў у партызаны, каб змагацца з польскімі захопнікамі. Аднак паступова ў Паўла адкрываюцца вочы, ён пачынае па-іншаму ўспрымаць падзеі, учынкі і саму Радзіму, падзеленую граніцай.

Над стварэннем фільма працавалі шаснаццаць месяцаў. Зусім хутка адбудзецца яго сустрэча з гледачамі. Пакуль мы чакаем прэм'еру, у тых жа сацыяльных сетках ужо пачынаюць гучаць пытанні, якім чынам будуць пададзены гістарычныя дэталі. У прыватнасці, ці будзе ў фільме гучаць беларуская мова?

— Асноўная мова ў фільме руская. Але ў кінастужцы прысутнічае і беларуская мова, толькі хутчэй у выглядзе трасянкі, — распавядае Ірына Філіпава. — А яшчэ з вуснаў нашых герояў мы пачуем яўрэйскую, польскую мовы. Можна казаць пра тое, што ў нашым фільме прысутнічае палітра з чатырох моў. І кожны з моўных акцэнтаў адцяняе нашых герояў, дадае пэўныя штрыхі да іх партрэтаў.

У працэсе стварэння карціны над ёй працавалі таксама кансультанты — гісторыкі Сяргей Трацяк і Вячаслаў Бандарэнка, яны чыталі некалькі варыянтаў сцэнарыя, давалі свае рэкамендацыі. Касцюмы стварала мастачка Людміла Сакалова. Няпростай была задача і ў мастака-пастаноўшчыка Уладзіміра Раманоўскага, у мастака па рэквізіце Аляксея Валынца. Ім патрэбна было дабудаваць і дапрацаваць каля 16 дэкарацый. Плюс работа над складаным грымам, з чым выдатна справілася мастачка Таццяна Баркун, у якой багаты вопыт работы на гістарычных фільмах. Таму карціну «На другім беразе», запэўніваюць аўтары, стваралі не проста абапіраючыся на ўяўленне, а вельмі сур'ёзна вывяраючы кожную дэталь.

Пасля прагляду кожны, пэўна, захоча падумаць пра тое, як і чым жыве, наколькі ведае мінулае сваёй зямлі, на які выбар і ахвяры гатовы дзеля сваёй краіны і блізкіх людзей. Убачыць стужку з 14 верасня можна будзе ў кінатэатрах «Цэнтральны», «Кастрычнік», «Аўрора», «Беларусь», «Мір» і «Ракета». Паказы фільма запланаваны там у абласных і раённых цэнтрах. Не прапусціце, каб скласці ўласнае ўражанне пра новую «ластаўку» кінастудыі «Беларусьфільм».

**Алена ДРАПКО.**
**Фота дадзена кінастудыяй «Беларусьфільм».**

# ЖУРНАЛІСТЫ ПА ФОРМЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета абароннае ведамства падрыхтавала інтэнсіўную праграму заняткаў. Упор — на навучанне навыкам работы ў зоне ўзброенага канфлікту. Заняткі праводзяцца як тэарэтычныя, так і практычныя. Сярод асноўных прадметаў — агнявая падрыхтоўка, сувязь і радыёперагаворы, рукапашны бой і самаабарона, асновы ваеннай тапаграфіі, інжынерная падрыхтоўка з упорам на парадак дзеянняў на замініраванай тэрыторыі.

У першы дзень вучэння журналістаў пазнаёмілі з узбраеннем і экіпіроўкай дэсантнікаў, умовамі ваеннай службы, вучэбна-матэрыяльнай базай. Раніца пачалася ў 6.00. Усім атрадам адправіліся на зарадку. Шчыра кажучы, было цяжкавата з нязвычкі. Пасля сняданку (а кормяць тут сапраўды смачна!) мы наведалі спецыяльную лекцыю, на якой распавялі пра падрыхтоўку журналістаў для работы ў зонах узброенага канфлікту.

Нас навучалі аказваць першую медыцынскую дапамогу і самадапамогу. І гэта, прызнацца, зусім не проста. Напрыклад, накласці самому сабе жгут, калі адна рука траўміраваная, — задача з «зорачкай». Яшчэ больш складана дацягнуць свайго параненага таварыша ў бяспечнае месца, каб аказаць яму першую медыцынскую дапамогу. У гэтым выпадку вага сапраўды мае значэнне. Адна справа цягнуць на сабе дзяўчыну, якая важыць 50 кілаграмаў, іншая — мужчыну з вагой пад сотню... Ускладняюць задачу бронекамізэлька і каска, з якімі мы не расстаёмся. Паспяхова, але не без складанасцяў, журналісты паспрабавалі свае сілы ў эвакуацыі параненага з бранятэхнікі.

Далей па праграме — інжынерная падрыхтоўка. Тут важна быць вельмі ўважлівымі, бо кожны неасцярожны крок можа стаць апошнім. Трэба звяртаць увагу на ненатуральнае размяшчэнне рэчаў. Спецыялісты настойваюць, што не трэба нічога чапаць, бо гэта можа аказацца пасткай.

Пасля інжынернай падрыхтоўкі прыйшоў час вадалазнай. Нацягнуўшы на сябе аквалангічныя касцюмы, апусціліся на дно вадаёма і нават знайшлі рукавіну. Сама вада была надзіва цёплай. У канцы другога дня адбыўся інструктаж па рукапашным баі — нас навучылі некаторым тэхнікам самаабароны.

Наперадзе яшчэ некалькі дзён. Будзем вывучаць асноўныя прыёмы і правілы выжывання, вучыцца здабываць і гатаваць ежу ў экстрэмальных умовах, даведаемся, як дзейнічаць пад артылерыйскім абстрэлам. Абавязкова пройдзем інтэнсіўную псіхалагічную падрыхтоўку. Таксама запланаваныя культурна-масавыя мерапрыемствы — ад выступленняў армейскіх творчых калектываў да песень каля вогнішча.

Вучэнне праводзіцца не першы раз. Папярэднія ўдзельнікі адзначаюць, што гэта адзін з самых эфектыўных курсаў па экстрэмальнай журналістыцы.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
*Палігон «Лосвіда».*

Сямейная газета

Выпуск № 16 (219)

# БЯСЦЭННЫ ДАР,

## або Тое, што нас яднае

*У вёсцы, дзе я нарадзілася, ёсць такі жарт: «Калі бульба не ўрадзіла — гэта гора. А калі ўрадзіла — яшчэ большае гора». Дык вось сёлета «Скарб» вырас на славу, таму на мінулыя выхадныя мы адправіліся на маю малую радзіму дапамагаць маці «гараваць». Бо (вясковыя людзі зразумеюць) сабрацца ўсёй сям'ёй на копку бульбы — гэта святое. Гэтым разам — і так паўтараецца штогод — мама падчас тэлефоннай размовы сказала: «Мо не едзьце. У вас жа сваіх спраў хапае, ды і на бензін шмат грошай пойдзе, не блізкі ж свет. Мо я неяк сама паціху выкапаю тую бульбу ці найму каго...» Мама, як заўсёды, у першую чаргу думае пра нас. А мы — пра яе. Зразумела, далёка (нам ехаць больш як 300 кіламетраў у адзін бок), зразумела, дорага, але тут гаворка зусім не пра грошы і нават не пра вялікую колькасць сваіх спраў (іх, як паказвае жыццё, у вёсцы не становіцца меней). А пра адчуванне сям'і, еднасці, калі ты разумееш, што не адзін у гэтым свеце. Што ёсць блізкія людзі, якія, калі трэба, кінуць усе свае справы і прыедуць на дапамогу. Дарэчы, пачуццё еднасці, характэрнае для беларускіх сем'яў спакон вякоў, нікуды не знікла і цяпер, мяркуючы па колькасці машын, якія мы сустрэлі на выездзе з Мінску ў пятніцу. Да варожкі не хадзі — большасць з іх ехалі дапамагаць бацькам капаць бульбу.*

*Што такое ўвогуле моцная сям'я? З гэтым пытаннем я звярнулася да некалькіх жанчын, прадстаўніц дружных, на мой погляд, «ячэек» грамадства. Некаторыя адказы расчулілі да слёз. «Моцная сям'я — гэта сям'я, дзе ўсе любяць адно аднаго і стараюцца, каб кожнаму было ўтульна і камфортна. Як кажуць, у дружнай сям'і і ў холад цёпла».*

*«Думаю, што моц сям'і — ва ўменні разам пераадольваць цяжкасці. Згадваю, як цяжка нам было, калі страшнае слова «анкалогія» ўвайшло ў наш дом. Мы стараліся не засмучаць маму і прасілі ў Дзеда Мароза не цацак, а здароўя для самага роднага чалавека. Памятаю, як святкаваліся ад шчасця маміны вочы, калі ўпершыню пасля тых выпрабаванняў тата павёз нас у Нясвіж і мы зноў пачалі падарожнічаць па Беларусі сям'ёй. З начоўкамі ў палатках на прыродзе, юшкай, прыгатаванай на вогнішчы... Нашы бацькі перажылі шмат цяжкасцяў, але працягвалі падтрымліваць адно аднаго, нягледзячы ні на што. І гэта быў прыклад для нас».*

*«Моцная сям'я — гэта калі мы сыходзім ад бацькоў і ствараем уласныя сем'і, калі сыходзяць ад нас, стаўшы дарослымі, дзеці, але ўсім хочацца часцей збірацца разам, дзяліцца сваім радасцямі і нягодамі, перамогамі і перажываннямі, знаходзіць агульнае рашэнне праблем, проста кантактаваць. У прыватнасці, нашу вялікую сям'ю як раней, так і цяпер гуртуе не толькі праца, але і песні. Мая бабуля часта паўтарала такую фразу: «Як патанцуеш, так і папрацуеш». Таму мы заўсёды збіраемся за сталом і спяваем. І гэта вельмі моцна збліжае».*

*Хтосьці параўнаў сям'ю з клетачкай, ад стану якой залежыць стан усяго арганізма — краіны. З гэтым не паспрачаешся, сапраўды, ад таго, наколькі моцнай і трывалай будзе кожная клетачка, у многім залежыць моц і трываласць нас, беларусаў, як нацыі. Менавіта таму так важна памятаць, што сям'я — гэта бясцэнны дар. Яго трэба берагчы, а не разбураць.*

*А яшчэ мне вельмі падабаецца кітайская прытча пра ЛАДную сям'ю, у якой налічвалася больш за сто чалавек. Славілася яна тым, што не было ў ёй ні сварак, ні лаянкі, ні разладаў. Дайшла пагалоска аб гэтай сям'і да самога імператара. І вырашыў ён праверыць, ці праўду кажуць людзі. Прыбыў у сяло, і душа яго парадавалася: чысціня і парадак, прыгажосць і мір. Добра дзецям, спакойна старым. Здзівіўся імператар і вырашыў даведацца, як дабілася гэтага ўсяго сям'я. З такім пытаннем ён і прыйшоў да старэйшыны роду. Той штосьці напісаў на аркушы паперы і працягнуў уладару. На паперцы былі напісаны ўсяго тры словы: «Любоў, Дараванне, Цярпенне». А ў самым нізе — прыпіска-ўдакладненне: «Сто разоў Любоў, сто разоў Дараванне, сто разоў Цярпенне». «І ўсё?» — здзівіўся імператар. — «Так, — адказаў старыя, — гэта і ёсць аснова ўсякай дружнай сям'і». І падумаўшы, дадаў: «І свету таксама».*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Тыя, хто побач

# 23 РУЖЫ ДЛЯ КАХАНАЙ

## Калі ты зрабіў свайго партнёра хоць крышачку больш шчаслівым, то дзень пражыты не дарэмна

**МНОГІЯ, у каго, здавалася б, ёсць самае галоўнае для шчасця — здароўе, чамусьці гэтага не цэняць і пастаянна скардзяцца на жыццё. Але ёсць іншыя, такія, як Алена і Канстанцін ЦЮХАЙ, якія, нягледзячы на фізічныя перашкоды, здольныя цаніць кожны пражыты дзень, быць удзячнымі Богу за тое, што маюць, і шчыра, як дзеці, радавацца простым рэчам.**

### МАРА ПРА ВЫСТАВУ

Алена і Косця пазнаёміліся ў Нясвіжскім інтэрнаце, куды абое трапілі па волі лёсу. А ён у кожнага з іх даволі няпросты. Алена перасоўваецца на інваліднай каляскі, Косця хоць і ходзіць сам, але мае праблемы з нагой і рукой. Нягледзячы на істотную розніцу ва ўзросце (Косця на 13 гадоў малодшы за Алену), яны знайшлі адно ў адным роднасныя душы. З таго дня так і трымаюцца разам.

— Бацюшка, які быў замацаваны за інтэрнатам, бачыў, што мы не ўяўляем жыцця адно без аднаго, і параіў узаконіць адносіны і павянчацца, — распавядае Алена. — Я ўдзячная Богу, што звёў мяне з Косцем, бо аб такім клапатлівым мужу і сябру, як ён, можна толькі марыць.

...Асабіста я ўпершыню ўбачыла гэтую пару ў доме-інтэрнаце «Камфортнае жыццё», што ў Мінскім раёне, куды яны пераехалі жыць два гады таму, на занятку па маляванні. Калі я зайшла, Алена акуратна наносіла пэндзлікам асобныя мазкі на паперу.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Алена і Косця падчас фотасесіі ў Нацыянальнай школе прыгажосці.

Нашы дзеці

# ДАПАМАГЧЫ ПАДЛЕТКУ ПРЫНЯЦЬ СЯБЕ,

## або Псіхалагічнае здароўе як важны складнік асобы

**ПСІХІЧНЫЯ, фізічныя і сацыяльныя змены ў жыцці падлеткаў адбываюцца вельмі хутка і накладваюць адбітак на іх самаадчуванне і ўспрыманне свету. Падлеткаў часта хвалюе, як зразумець сябе і займець самаўпэўненасць, як рэагаваць на стрэсы, змагацца са страхамі, трывожнасцю, агрэсіяй, булінгам, суіцыдальнымі думкамі. І задача спецыялістаў — дапамагчы дзецям пераадолець гэтыя праблемы. Па даручэнні Мінадукацыі была створана рэспубліканская сетка крызісных цэнтраў, у склад якой увайшлі 127 педагогаў-псіхолагаў з усіх рэгіёнаў краіны. Іх задача — прафесійна рэагаваць на крызісныя з'явы на месцах. Што робіцца ў Беларусі, каб дапамагчы падрастаючаму пакаленню справіцца з падлеткавымі праблемамі, расказалі эксперты.**

### ШОСТЫ ШКОЛЬНЫ ДЗЕНЬ

Сёлета ў інструктыўна-метадычным лісце Мінадукацыі, прысвечаным арганізацыі сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы ў школе, выхаванню псіхалагічнай культуры вучняў адведзены цэлы раздзел. А пры планаванні мерапрыемстваў па дадзеным кірунку педагогам раяць абапірацца на змест адпаведнага раздзела праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і рабочай моладзі, расказала **Наталля КАТОВІЧ, начальнік упраўлення выхаваўчай і ідэалагічнай работы Нацыянальнага інстытута адукацыі.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Прыярытэты

# ПАДТРЫМКА СЕМ'ЯЎ: маштабна, сістэмна, своечасова

**У Беларусі выбудавана свая сістэма сацыяльна-эканамічнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. У 2023 годзе на дзяржаўныя дапамогі выдзелена 3,5 мільярда рублёў, з іх два мільярды — на выплату дапамог па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Выплатамі ахоплена 397,5 тысячы дзяцей (кожнае чацвёртае дзіця ў краіне), з іх 220 тыяч — дзеці да трох гадоў.**

Асноўным звяном гарантаванай матэрыяльнай падтрымкі пры нараджэнні і выхаванні дзяцей з'яўляецца сістэма дзяржаўных дапамог, якую ўмоўна можна падзяліць на тры групы: дапамогі па мацярынстве, сямейныя дапамогі і дапамога па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці.

Самыя значныя — аднаразовая дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці і штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, якія назначаюцца незалежна ад даходаў сям'і і выплаты страхавых узносаў. Памер аднаразовай дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці складае 10 БПМ, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14 БПМ.

Штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў вышэйшая за мінімальную заработную плату ў краіне: на першае дзіця — 35 працэнтаў сярэдняй заработнай платы (СЗП) работнікаў у краіне за квартал (606 руб.), на другое і наступных дзяцей — 40 працэнтаў СЗП (693 руб.), на дзіця-інваліда — 45 % СЗП (779 руб.).

Пры выхаванні ў сям'і дваіх і больш дзяцей, адно з якіх ва ўзросце да трох гадоў, выплачваюцца дзве дапамогі: на дзіця да трох гадоў (40 % СЗП) і дзіця (дзяцей) ад 3 да 18 гадоў (50 % БПМ).

Выплата дапамог — сістэмны механізм падтрымкі сем'яў. Калі сям'я аказалася ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, на яе распаўсюджваецца сістэма дзяржаўнай адрасная дапамогі. Яна ўключае штомесячную і аднаразовую сацыяльную дапамогу, дапамогу на набыццё сродкаў гігіены для дзяцей-інвалідаў, забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця. На аказанне адрасная сацыяльнай дапамогі ў 2023 годзе выдзелена 132,7 мільёна рублёў.

Беларусь з'яўляецца адной з нямногіх краін, дзе можна знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да спаўнення яму трох гадоў і атрымліваць за ўвесь гэты перыяд дзяржаўную дапамогу ў поўным памеры незалежна ад афармлення дзіцяці ў дашкольную ўстанову адукацыі. Сістэма выхаду ў водпуск гібкая — яго можна падзяліць на часткі любой працягласці. На бацьку, які знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, распаўсюджваюцца тыя ж гарантыі, што і на маці.

Рэалізоўваецца праграма сямейнага капіталу пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга ці наступнага дзіцяці. Яго памер складае амаль 30 тысяч рублёў. За перыяд рэалізацыі праграмы сямейнага капіталу, пачынаючы з 2015 года, адкрыта больш за 129 тысяч укладаў «Сямейны капітал» на суму 826 мільёнаў долараў ЗША і больш за 1,2 мільярда рублёў.

З улікам патрэб шматдзетных сем'яў прадугледжана магчымасць датэрміновага распараджэння сродкамі сямейнага капіталу на будаўніцтва (рэканструкцыю), набыццё жылля, пагашэнне крэдытаў, пазык арганізацый, дадзеных на гэтыя мэты, атрыманне адукацыі і медыцынскіх паслуг (у тым ліку стаматалагічных, куплю медыцынскіх вырабаў і лекаў), набыццё тавараў для сацыяльнай рэабілітацыі і адаптацыі членаў сям'і з інваліднасцю (у сувязі з захворваннямі апорна-рухальнага апарату, органаў зроку).

У краіне выбудавана магутная сістэма дзяржаўнай падтрымкі шматдзетных сем'яў пры будаўніцтве або рэканструкцыі жылля. Рашэннем кіраўніка дзяржавы прадугледжана накіраванне шматдзетных сем'яў на будаўніцтва жылля на працягу аднаго года з даты пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу. Летась з дзяржаўнай падтрымкай палепшылі жыллёвыя ўмовы 11,2 тысячы шматдзетных сем'яў.

Апроч матэрыяльных выплат, для сем'яў з дзецьмі прадугледжаны шэраг іншых сацыяльных гарантый, фінансаванне якіх забяспечваецца з дзяржаўнага бюджэту і якія істотна эканомяць бюджэт сям'і.

Напрыклад, субсідзіраванне сістэмы адукацыі — у дзіцячых садках бацькі аплачваюць толькі харчаванне дзіцяці, а для шматдзетных сем'яў аплата за харчаванне зніжаецца на 50 %, для сем'яў з двума дзецьмі-дашкольнікамі плата зніжаецца на 30 %. У школе ўсе дзеці пачатковых класаў харчуюцца бясплатна, старэйшыя дзеці са шматдзетных сем'яў, з малазабяспечаных сем'яў і далей атрымліваюць бясплатнае харчаванне.

Ажыццяўляецца бясплатнае медыцынскае абслугоўванне, санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне непаўналетніх дзяцей, забеспячэнне лекавымі сродкамі дзяцей ва ўзросце да трох гадоў і дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў.

Таксама падтрымка бацькоў прадстаўлена гарантыямі ў працоўнай сферы, якія з'яўляюцца абавязковымі для рэалізацыі ўсімі наймальнікамі і фарміруюць ключавыя ўмовы для камфортнага сумяшчэння бацькоўства і работы.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ДАПАМАГЧЫ ПАДЛЕТКУ ПРЫНЯЦЬ СЯБЕ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

— Адпаведныя мерапрыемствы маюць на мэце паспяховую адаптацыю навучэнцаў да ўмоў выхавання і навучання, якія мяняюцца, развіццё псіхалагічнай ўстойлівасці да негатыўнага ўздзеяння сацыуму, зніжэнне ўзроўню трывожнасці і агрэсіўнасці, прывіццё навыкаў канструктыўных паводзін і вырашэння канфліктных сітуацый, інфармаванне вучняў пра тэлефоны даверу і гарачыя лінія па аказанні псіхалагічнай дапамогі, выяўленне і папярэджанне суіцыдальных схільнасцяў падлеткаў, падтрымку і заахвочванне адораных вучняў да ўдзелу ў конкурсах, выставах, алімпіядах.

Мэта сёлетняга вучэбнага года — прыняць дзейсныя меры, каб забяспечыць стапрацэнтную занятасць школьнікаў у шосты школьны дзень і на канікулах. Гэта, напрыклад, спартыўна-масавая работа, якая праводзіцца ў шосты дзень тыдня і нароўні з урокамі фізкультуры і заняткамі ў спартыўных гуртках дапамагае ўмацоўванню фізічнага здароўя. А яшчэ садзейнічае ўсведамленню каштоўнасці здаровага ладу жыцця і фарміраванню станоўчай псіхаэмацыйнай абстаноўкі ў калектыве, пераканана спецыяліст:

— Пры арганізацыі работы педагогі могуць выкарыстоўваць дапаможнікі з грыфам «Рэкамендавана навукова-метадычным установам «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь». Усе праграмы факультатыўных заняткаў і ўсе дапаможнікі з грыфам адпрацаваны, прайшлі экспертызу і рэцэнзаванне.

Факультатыўныя заняткі маюць розную тэматыку і скіраваны, напрыклад, на фарміраванне здаровага ладу жыцця, уменне вучняў адмовіцца ад ужывання шкодных рэчываў, паказ турыстычнага патэнцыялу краіны, падрыхтоўку валанцёраў.

## НЕ ПЕРАЖЫВАННЕ, А ДЗЕЯННЕ

У красавіку 2019-га быў створаны Рэспубліканскі цэнтр псіхалагічнай дапамогі, што аказваецца як на базе цэнтра, так і з выездам на месцы (ва ўстановы адукацыі). Сюды ўваходзяць метадычныя распрацоўкі, буклеты, практыкумы для псіхолагаў школьных устаноў, бацькоў і дзяцей у інтарэсах стварэння і падтрымлівання бяспечнага асяроддзя, расказаў **Дзмітрый СЕННІКАЎ, педагог-псіхолаг аддзела псіхалагічнай дапамогі ў крызісных сітуацыях Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі:**

— Мы арганізоўваем семінары для рэгіянальных псіхолагаў па авалоданні навыкамі крызіснага ўмяшання, распрацоўваем навучальныя праграмы для педагогаў-псіхолагаў. З 2021 года да жніўня 2023-га цэнтрам у межах метадычна-навучальнай дзейнасці праведзена звыш 160 мерапрыемстваў, зафіксавана больш як 15 тысяч зваротаў па дапамогу.

Са снежня 2021 года дзейнічае анлайн-платформа **www.talk2ok.by** для аказання інфармацыйнай і псіхалагічнай падтрымкі падлеткам і іх законным прадстаўнікам. Работа рэсурсу датычыцца непасрэднай псіхалагічнай дапамогі ў крызісных сітуацыях і суправаджэння ў посткрызісны перыяд ва ўстановах адукацыі. Кансультацыі аказваюцца пры асабістых сустрэчах ці анлайн (па тэлефонах **8-801-100-16-11** і **+375 17 263 03 03,** на сайце або праз Jivo-чат. Займаюцца ў цэнтры і экспертнай падтрымкай у вядзенні пэўных выпадкаў (супервізіяй) для настаўнікаў, педагогаў-псіхолагаў, адміністрацыі ўстаноў адукацыі.

— Ва ўмовах зменлівага свету і пад уплывам шматлікіх фактараў маладыя людзі сутыкаюцца з негатыўнымі эмацыянальнымі станамі, якія могуць сур'ёзна падарваць іх псіхалагічны дабрабыт. Таму разуменне і падтрымка падлеткаў з'яўляюцца складнікам для стварэння іх станоўчага псіхалагічнага здароўя. Само па сабе яно не ўзнікае, а з'яўляецца вынікам навучання і выхавання. Дакладнага вызначэння тэрміна «псіхалагічнае здароўе» сёння няма, аднак вучоныя мяркуюць, што гэта дабрабыт асобы і яе здольнасць да адаптацыі, схільнасць да дзеяння, а не да перажывання. Сюды ж адносяцца добры настрой, прынятне сябе, творчасць, адказнасць за свае ўчынкі, самастойнасць і іншае, — заўважыў Дзмітрый Сеннікаў. — Важна, каб дзеці навучыліся пазітыўна ацэньваць сябе і свае дасягненні, разумелі свае эмоцыі і эмоцыі іншых (каб была эмацыянальная стабільнасць), валодалі сацыяльнымі навыкамі, умелі кіраваць сваім часам.

## ЯК ПАЗНАЁМІЦЦА НЕ НА САЙЦЕ?

У сталіцы на базе дзіцячых паліклінік працуе дзевяць цэнтраў, сяброўскіх да падлеткаў і моладзі, а ў Беларусі такіх цэнтраў 58. На прыём прыходзяць як дзеці, так і бацькі, а сярод частых пытанняў — выхаваўчыя, сцвярджае **Таццяна МАКОЎСКАЯ, псіхолаг сяброўскага да падлеткаў цэнтра «Ветразь надзеі» пры 7-й гарадской дзіцячай паліклініцы:**

— Прыходзяць да нас ужо з вынікам, а мы шукаем прычыны, якія каранямі, як правіла, сыходзяць у пачатковую школу (да ўзаемадзеяння бацькоў і дзіцяці). Мы працуем са школамі, ходзім на бацькоўскія сходы, у цэнтры працуюць таксама гінеколаг і валеолаг (займаецца комплексным вывучэннем індывідуальнага здароўя чалавека).

Школы зацікаўлены ў тым, каб прыводзіць дзяцей на лекцыі і групавыя заняткі і запрашаць спецыялістаў да сябе, пацвердзіла і **Вольга ЗАКРУТА, акушэр-гінеколаг сяброўскага да падлеткаў цэнтра «Юнікс» пры 4-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклініцы.**

— Цэнтр у нас ананімны, таму падлеткі з ахвотай прыходзяць на індывідуальныя кансультацыі, запісваюцца на іх у тым ліку праз чат і «Інстаграм». Калі мы бачым, што дзіцяці трэба зняць напружанне, то праз дзень-два яго прымаюць на масаж ці лячэбную фізкультуру рэабілітолаг або фізіятэрапеўт.

Важна, што з 14 гадоў падлетак можа звярнуцца да псіхолага без ведама дарослых і застацца ананімным. Пры гэтым атрыманыя ад спецыяліста веды трэба яшчэ навучыцца прымяняць на практыцы, каб яны не засталіся проста прыгожымі словамі. Таму задача кожнага цэнтра — не толькі кансультаванне, але і абмеркаванне пытанняў, педагагічная карэкцыя, абследаванне ва ўрачоў, лічаць эксперты.

Сярод задач цэнтра сяброўскага стаўлення да падлеткаў і моладзі «Ювентус» пры 17-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклініцы — профілактыка неінфекцыйных захворванняў і інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, ужыванне алкаголю і наркотыкаў, падзялілася **Інэса ПАЛАЗНІК, урач цэнтра па медыцынскай прафілактыцы захворванняў:**

— Праблемы ў падлеткаў часта выклікаюць і разводы маці з бацькам, і стварэнне імі другіх шлюбаў. Як пабудаваць сям'ю, як пазнаёміцца не на сайце, а ў жыцці — сапраўдная праблема не толькі падлеткаў, але і іх бацькоў. Псіхагігіена палавога жыцця ў нас знаходзіцца на ўзроўні пятага класа, і задача цэнтра — забяспечыць падлетка інфармацыйна-метадычнымі дапаможнікамі і навыкамі ў гэтым плане.

Два-тры разы на год у цэнтры навучаюцца школьныя педагогі. Заняткі праходзяць з элементамі трэнінгу — не проста лекцыі, а дыялог з пытаннямі і адказамі. На працягу года цэнтр вядзе анлайн-анкетаванні, у якіх удзельнічае шмат падлеткаў. Працуюць і з падлеткамі-інвалідамі ад 14 гадоў.

У цэнтры «Ювентус» можна прайсці комплексную медыка-псіхасацыяльную рэабілітацыю падлеткаў груп рызыкі, у тым ліку тых, хто жыве з ВІЧ-інфекцыяй. Гэта праект 2023 года, у які ўваходзіць навучанне валанцёраў, роўных кансультантаў (навучаныя падлеткі ў сваім асяроддзі такім жа, як яны самі, могуць расказаць аб правілах культуры інтымных адносін).

**Ірына СІДАРОК.**

## КАБ КАРЦІНЫ СВЕТУ СУПАЛІ...

За апошнія тры гады запатрабаванасць у псіхолагах у падлеткаў значна ўзрасла. Назіраецца нават пэўная мода на наведванне падобных спецыялістаў, і падлеткі спакойна, не саромеючыся, абмяркоўваюць, да якіх урачоў яны ходзяць, расказала **Надзея САРОКІНА, псіхолаг сяброўскага да падлеткаў цэнтра «Галс» пры 13-й гарадской дзіцячай паліклініцы:**

— Падлетку вельмі важна, каб яго прымалі такім, які ён ёсць, і гэтую думку мы даносім і да бацькоў дзяцей. Па прычыне ўзросту непаўналетнія валодаюць высокай крытычнасцю і чорна-белым мысленнем. Тое ж самае ў большасці выпадкаў датычыцца і бацькоў, таму даводзіцца вучыць іх чуць адзін аднаго, каб яны ўбачылі карціну свету іншага. У маёй практыцы быў выпадак, калі канфлікты ў сям'і вырашыліся, калі маці дазволіла дочкам пераклеіць шпалеры ў пакоі.

Сярод праблем, з якімі падлеткі прыходзяць да псіхолагаў, часта сустракаюцца пытанні ранняга пачатку палавога жыцця, прафілактыкі інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, здаровага ладу жыцця, харчавання, галаўных болеў. Сярод тэм таксама і культура сямейных адносін.

# 23 РУЖЫ ДЛЯ КАХАНАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Алена ўпершыню менавіта ў нашым доме-інтэрнаце пачала маляваць фарбамі, а не алоўкамі. Як бачыце, у яе гэта цудоўна атрымліваецца. Хоць калі б вы толькі ведалі, колькі намаганняў ёй для гэтага патрабуецца! Па спіне цячэ пот, калі яна дамалёўвае свой чарговы пейзаж. Алена вельмі працавітая і мэтанакіраваная, — кажа кіраўнік гуртка па маляванні Арцём Гадалаў. — Дарэчы, і Косця таксама, гледзячы на жонку, захапіўся маляваннем. Яго тэма — караблі. Яны ў яго вельмі добра атрымліваюцца.

— Аленіна мэтанакіраванасць уражвае і з'яўляецца прыкладам у тым ліку і для нас з мужам, — кажа Алена Гадалава, якая працуе ў доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў культарганізатарам. — Мы стараемся развіваць яе талент, усяляк падтрымліваць. У прыватнасці, у нас ёсць мара зладзіць персанальную выставу яе карцін. З фуршэтам, з запрашэннем журналістаў, тэлебачання. Зрабіць для Алены сапраўднае свята. Засталося толькі знайсці спонсараў...

## ПРАМЕНЬ ДЛЯ МУЖА

Алена Гадалава расказвае, што пазнаёмілася з гэтай парай у Нясвіжы два гады таму.

**«Інтэрнат новы, сучасны, і нам як сямейнай пары адразу ж выдзелілі самы вялікі пакой».**

— Неўзабаве пасля адкрыцця нашай установы мы ездзілі па іншых падобных інтэрнатах і запрашалі ўсіх ахвотных пераехаць да нас жыць. Памятаю, як разам з выхаванцамі Нясвіжскага інтэрната сабраліся за сталом, разам пілі гарбату і размаўлялі. Менавіта тады я ўпершыню звярнула ўвагу на Алену і Косцю. Яны ўвесь час жартавалі, усміхаліся. Але больш за ўсё мяне ўразіла тое, як Косця клапаціўся пра Алену. Гэта было настолькі натуральна і гарманічна! Было відаць, што ён гэта робіць не на публіку. Мяне да глыбіні душы кранула, што цяжка і аднаму, і другому, але можна так проста трымацца разам і не наракаць на лёс.

— Нягледзячы на ДЦП і звязаныя з гэтым дыягназам асаблівасці маўлення, Алена пачала вучыць да свят вершы, — працягвае культарганізатар. — Калі я першы раз ёй гэта прапанавала, яна крыху разгубілася. Але потым сама выбрала верш у інтэрнэце і вельмі добра яго вывучыла на памяць. Цяпер у нас такая традыцыя: да ўсіх святочных канцэртаў Лена абавязкова развучвае штосьці новае. Яна сама выбірае доўгі і даволі складаны верш. А мужу і сваім сябрам-калясачнікам — карацейшыя, і кантралюе, каб яны ўсё добра вывучылі. Алена нават навучылася правільна дыхаць, калі чытае верш. Я адымаю мікрафон, каб яна зрабіла ўдых — і тады яна вымаўляе наступны радок.

Калі Косця з Аленай да нас пераехалі, першае, што ўразіла, — чысціня і ўтульнасць, якія яны падтрымліваюць у сваім пакоі. Гэтая сямейная пара з'яўляецца цэнтрам прыцягнення для іншых жыхароў. Да іх у пакой пастаянна прыходзяць госці, яны разам п'юць гарбату, каву. Алена — лідар нашай мужчынскай тусоўкі (сёння ў доме-інтэрнаце сярод маладых інвалідаў толькі адна жанчына. — **Аўт.**). Таму калі трэба сабрацца на нейкае мерапрыемства ці штосьці абмеркаваць, я заўсёды звяртаюся менавіта да яе, бо ведаю, што яна хуценька арганізуе астатніх. Алена вельмі адказная. Гэтую адказнасць яна прывівае і Косцю. Яна для яго як прамень, і ён на гэтае святло ідзе.

## СЯМ'Я, ЯКУЮ ТЫ САМ ВЫБІРАЕШ

Пасля абеду я зазірнула ў пакой да Алены і Косці. І сапраўды была прыемна здзіўлена — настолькі там па-дамашняму ўтульна. Алена і Косця разам са сваім сябрам сядзелі за сталом і пілі гарбату.

— Знаёмцеся, гэта Валодзя — анёл-ахоўнік нашай сям'і. Ён быў сведкам на нашым вяселлі, а цяпер жыве ў суседнім пакоі.

**«Многія думаюць, што галоўнае ў сям'і — грошы. Але без кахання, узаемнай падтрымкі і шчырага жадання радаваць адно аднаго гэтыя паперкі нічога не вартыя».**

— Я сюды прыходжу як да сябе дадому, — усміхаецца мужчына.

— Пасля таго, як Нясвіжскі інтэрнат закрылі, мы з Косцем пераехалі ў «Камфортнае жыццё», — распавядае Алена. — Валодзю ж перавялі ў Лагойск. Але як толькі сюды завіталі прадстаўнікі з камітэта (па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама. — **Аўт.**), мы з мужам папрасілі, каб нашага сябра перавялі ў гэты дом-інтэрнат. Так як былі свабодныя месцы, нам пайшлі насустрач.

— З Аленай я знаёмы ўжо 15 гадоў, ажно з Івянецкага дзіцячага дома-інтэрната. Таму наша сяброўства сапраўднае, праверанае часам. Косця з Аленай для мяне вельмі дарагія. Яны нават больш, чым сябры — гэта мая сям'я. Таму я адчуваю за іх адказнасць. Бацюшка мяне папрасіў, паколькі я быў у іх сведкам на вяселлі, рабіць усё магчымае, каб гэты шлюб не

У пакоі сямейнай пары ўтульна як дома.

**У Алены столькі пазітыву і веры ў будучыню, што Косця побач з ёй таксама свеціцца, становіцца напоўненым і ўпэўненым у сваіх сілах.**

разваліўся. Алена і Косця, як вы, напэўна, заўважылі, вельмі гаспадарлівыя. Дырэктар дома-інтэрната ім як сямейнай пары выдзеліла халадзільнік, але Лена захацела, каб у іх з Косцем быў свой, — тлумачыць Валодзя. — Таму, як толькі з'явілася такая магчымасць, скінуліся і купілі яго. Ад пенсіі па інваліднасці нам застаецца 10 працэнтаў (астатняе ідзе на пражыванне), якія-ніякія грошы ёсць, і мы імі распараджаемся як хочам.

— Мне заўсёды хацелася стварыць там, дзе я жыву, дамашнюю абстаноўку, — кажа Алена. — Але ў Нясвіжы не было такой магчымасці, бо там, калі б і хацеў штосьці набыць, не было дзе паставіць, пакойчык быў маленькі. А тут інтэрнат новы, сучасны, і нам як сямейнай пары адразу ж выдзелілі самы вялікі пакой.

— Да нас тут вельмі добра ставяцца, — кажа Косця. — І кормяць вельмі добра. Але ўсё адно час ад часу заказваем дастаўку, каб Лену папесціць марожаным і сезоннай садавіной — клубніцамі, чарэшнямі, персікамі, абрыкосамі...

Алена і Косця рэгулярна наведваюць малітоўны пакой, тым самым паказваюць прыклад астатнім.

На сцяне над ложкам вісяць вясельныя фотаздымкі ў рамачках.

## ДУХОЎНАЯ ЕДНАСЦЬ

Яшчэ звярнула ўвагу, што на сценах і кніжных паліцах у пакоі Алены і Косці шмат ікон. Частку набывалі самі, іншыя атрымалі ў падарунак. У гэтай пары, паводле слоў культарганізатара, духоўнае паразуменне. Абое вераць у Бога, таму вельмі абрадаваліся, калі сёлета ў доме-інтэрнаце адкрыўся малітоўны пакой.

— Айцец Стэфан, настаяцель прыхода Храма свяшчэннапакутніка Уладзіміра Іраскі, асвяціў яго і блаславіў мяне, бо я ў свой час скончыла курсы пры Духоўнай акадэміі, чытаць тут малітвы з насельнікамі дома-інтэрната, — кажа Алена Гадалава. — Калі ў нас яшчэ не было малітоўнага пакоя, мы збіраліся ў актавай зале. Алена з Косцем не прапусцілі ніводную нашу сустрэчу. Яны ведаюць на памяць усе асноўныя малітвы і з'яўляюцца прыкладам для іншых, у тым ліку і ў духоўным жыцці. Калі бачаць, што ў кагосьці з супрацоўнікаў дома-інтэрната нейкія праблемы, абавязкова моляцца за іх. У прыватнасці, жыццёвыя абставіны склаліся так, што мы з мужам ужо збіраліся сыходзіць з дома-інтэрната. Дык яны мне нядаўна сказалі: «Мы молімся, каб вы з Арцёмам Анатольевічам не сышлі ад нас!» І што вы думаеце? Намалілі, што мы ўрэшце засталіся тут працаваць на паўстаўкі!

А яшчэ ў пакоі Алены і Косці шмат кветак. Яны паўсюль — на паліцах, на падаконніках, самыя вялікія — у гаршках на падлозе.

— Алена вельмі любіць кветкі, — кажа Валодзя. — І Косця, ведаючы гэта, на пяцігоддзе іх сумеснага жыцця вырашыў парадаваць каханую і зрабіць ёй сюрпрыз. Мы, сябры, таксама далучыліся. У выніку падарылі Лене 23 ружы. Яна не чакала такога. І нават расплакалася ад шчасця.

— А якога колеру ружы?

— Белага, — усміхаецца Алена. — Гэта мой любімы колер.

Для сваіх 45 гадоў Алена цудоўна выглядае, з густам апранаецца. А яшчэ Косця навучыўся вельмі добра рабіць жонцы прычоску. Некалькі месяцаў таму Алене з Косцем нават зладзілі прафесійную фотасесію ў Нацыянальнай школе прыгажосці. Гэта быў для іх вельмі цікавы досвед.

## МАРЫ ПАДАТКАМІ НЕ АБКЛАДАЮЦЦА

«Івашка — турыст!» — данеслася з клеткі з папугайчыкам...

— Папугай у нас незвычайны. Гэта Косця яго навучыў размаўляць. Івашка жыве ў нас ужо трэці год, а чарапашкі (Алена паказвае на акварыум) — пяты. Іх нам падарыла на гадавіну вяселля медсястра, яшчэ калі мы жылі ў Нясвіжы. Косця ў мяне наогул малайчына, — кажа Алена, і па вачах і інтанацыі відаць, як яна ганарыцца мужам, — сам навучыўся рамантаваць камп'ютары, мабільныя тэлефоны, мяне прашыўкі. У яго гэта цудоўна атрымліваецца. Калі хтосьці папросіць штосьці адрамантаваць, Косця ніколі не адмаўляе.

Ужо потым ён прызнаўся, што марыць займацца рамонтам камп'ютараў прафесійна. Каб мець магчымасць часцей дарыць жонцы кветкі.

У Алены таксама ёсць мара. І не адна. Яна вельмі хоча, як сапраўдная гаспадыня, гатаваць ежу для сваёй сям'і. А таксама сказала, што была б самай шчаслівай, калі б пабачыла мора.

— Месяц таму мы на вадасховішча з імі выходзілі, — кажа Уладзімір. — Дык Алену хлопцы на руках занеслі ў ваду. Яна радавалася як дзіця! У Алены столькі пазітыву і веры ў будучыню, што Косця побач з ёй таксама свеціцца, становіцца напоўненым і ўпэўненым у сваіх сілах.

На развітанне я папрасіла Алену і Косцю падзяліцца сакрэтам сямейнага шчасця. І пачула вельмі глыбокую рэч. Многія думаюць, што галоўнае ў сям'і — грошы. Аднак без кахання, узаемнай падтрымкі і шчырага жадання радаваць адно аднаго гэтыя паперкі нічога не вартыя. Калі ты зрабіў свайго партнёра хоць крышачку больш шчаслівым, то дзень пражыты не дарэмна.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота аўтара і Вадзіма КАТКОЎСКАГА.**

# АД АСІНКІ НЕ НАРОДЗЯЦЦА АПЕЛЬСІНКІ

## Да чаго могуць прывесці нябачныя свету траўмы

**УСЕ бацькі, здаецца, жадаюць сваім дзецям дабра. Але чаму менавіта яны часта наносяць раны, якія не гояцца вельмі доўга? Да якіх наступстваў вядуць тыя памылкі, што наўмысна ці мімаволі здзяйсняюць дарослыя ў адносінах з дочкамі і сынамі? Гутарым пра гэта з псіхолагам Таццянай ШАРАНДА.**

***— Складанасці ў дзіцячa-бацькоўскіх адносінах, непрыемныя падзеі здараюцца ў кожнай сям'і. Але вось што мяне здзіўляе. Чаму ў адных псіхалагічныя траўмы, атрыманыя ў дзяцінстве, пакідаюць глыбокі след, а іншых амаль не кранаюць? Чаму адны людзі пасля «жахаў» дзяцінства захоўваюць стойкасць і аптымізм, а іншыя, якія выраслі ў добрай сям'і, усё жыццё пакутуюць з-за таго, што мама «больш любіла брата»?***

— Характар асобы, яго паводзіны, адносіны з навакольным светам вызначаюцца перш за ўсё сацыяльнымі ўмовамі і тыпам тэмпераменту.

Яшчэ Платон прыкмеціў дзіўную заканамернасць: «Цяжкія часы нараджаюць моцных людзей. Моцныя людзі ствараюць добрыя часы. Добрыя часы нараджаюць слабых людзей. Слабыя людзі ствараюць цяжкія часы». Гэтая заканамернасць праглядаецца на працягу ўсёй гісторыі развіцця чалавецтва. Вайна і пасляваенны перыяд — цяжкі час, калі выжывалі наймацнейшыя. Загартаванае пакаленне, якое прайшло праз нягоды і страты, не было эгацэнтрычным, клапацілася і думала не толькі пра сябе, стварала і аддавала.

Яно падрыхтавала «добрыя часы», але сфарміравала спажывецкае грамадства. Насыціўшы сябе «хлебам надзённым», людзі сталі адчуваць эмацыянальны голад, ім захацелася відовішчаў. Сацыяльныя змены, безумоўна, адбіліся на асаблівасцях пакалення «дзяцей». Разам з тым прыкметную ролю ў нашых рэакцыях на ўдары з боку навакольнага свету адыгрываюць і індывідуальныя асаблівасці вышэйшай нервовай дзейнасці, уласцівыя ад нараджэння і нязменныя на працягу жыцця, сіла і рухомасць нервовых працэсаў, якія закладваюць тэмперамент.

***— Спынімся ўсё ж на сям'і, якая лепш за ўсё абараняе кожнага з нас і дзе часам, на жаль, балюча раняць. Якія дзеянні з боку бацькоў здольныя нанесці дзецям сур'ёзныя псіхалагічныя траўмы?***

— Фізічны, эмацыянальны, сэксуальны гвалт і маральная жорсткасць.

***— Думаю, фізічны гвалт сустракаецца сёння ў асноўным у асацыяльных сем'ях. Якія яго наступствы?***

— Безумоўна, гвалт як стыль выхавання ўласцівы, як правіла, асацыяльным сем'ям, сама атмасфера якіх насычана канфліктнасцю, нервовасцю, страхамі. Дзеці там рана сталеюць, часта капіруюць мадэль паводзін бацькі і маці, выпрацоўваюць спецыфічную стратэгію выжывання. Фізічнае насілле, як правіла, суправаджаецца эмацыянальным: крыкамі, лаянкай, абразамі. Любыя ўдары, аплявухі абвастраюць базавы інстынкт самазахавання. Паводзіны такіх дзяцей вызначаюцца, з аднаго боку, страхам, з другога — агрэсіяй.

***— Фізічныя пакаранні ва ўладкаваных сем'ях з любячымі бацькамі не такія небяспечныя і траўматычныя для псіхікі дзяцей?***

— Любячыя клапатлівыя бацькі могуць таксама сарвацца і шлёпнуць па мяккім месцы. Але ў такіх сем'ях пакаранне звычайна — рэдкая з'ява, і яно выключае жорсткасць. Напрыклад, дачка згубіла мабільнік, а бацька, не ведаючы аб гэтым, не мог звязацца з ёй. Калі дзяўчынка вярнулася, не вытрымаў і ўзяўся за рэмень, не выслухаўшы ніякіх апраўданняў. У гэтым выпадку прычынай бацькоўскай агрэсіі стаў страх за дачку. Часам я чую ад кліентаў: «А што будзе, калі я некалькі разоў шлёпну сваё дзіця?» Хочацца нагадаць: рукапрыкладства — гэта роспіс у бяссіллі. У здаровых сем'ях, на шчасце, гэта разумеюць.

***— Гэта значыць, ніякага выхаваўчага значэння фізічныя пакаранні не маюць?***

— Ніякага! Рукапрыкладства — гэта зняцце агрэсіі, назапашанага напружання самім бацькоў. У іх не хапае ўнутранай сілы, слоўнікавага запасу, душэўнай цеплыні, каб данесці да дзіцяці свой «мэсэдж», спакойна растлумачыць, чым выклікана іх незадаволенасць, што ў паводзінах сына ці дачкі іх закранула. Часам дастаткова мацярынскага або бацькоўскага погляду ці іх дакранання да дзіцячай рукі, каб даць ясна зразумець: пяройдзена чырвоная рыса, трэба неадкладна спыніцца.

***— А калі бацька, напрыклад, само дзіця не чапае, але на яго вачах зневажае маці? Гэта таксама не застаецца без наступстваў для дзіцячай псіхікі?***

— У такіх выпадках у дзяцей фарміруецца нянавісць да бацькі і страх перад ім, асабліва калі мужчына распускае рукі і гэта паўтараецца рэгулярна. Калі жанчына своечасова сыдзе разам з дзіцем ад такога мужа, то сцэны гвалту могуць забыцца і псіхічныя наступствы будуць мінімальнымі. Часта ў дзяцей, якія выраслі ў такой абстаноўцы, з часам з'яўляецца перакананне, што мама сама правакавала бацьку на рукапрыкладства, яны адчуваюць раздражненне і крыўду на яе. Дочкі, пасталеўшы, нярэдка пачынаюць адчуваць у дачыненні да бацькі таксічную любоў, апраўдваючы яго. «Рэха» перанесеных у дзяцінстве траўмаў адгукаецца часам у самым нечаканым выглядзе. Успамінаю пару, якая была ў мяне на кансультацыі. І муж, і жонка — з сем'яў алкаголікаў. Але: абодва вядуць абсалютна здаровы лад жыцця, робяць зарадку, абліваюцца халоднай вадой, не ўжываюць мяса і г. д. І ўсё б выдатна. Але яны гэтымі хранічнымі клопатамі аб здароўі затэарызавалі ўласных дзяцей, якія гатовы збегчы з роднай хаты.

***— Як часцей за ўсё праяўляюцца маральная жорсткасць і эмацыйнае зневажанне?***

— У выглядзе разнастайных абраз, прыніжэнняў, абясцэньванняў, пагроз, навешвання ярлыкоў, неабгрунтаваных забарон. Нярэдка дзіця чуе ў свой адрас: «У цябе абедзве рукі — левыя», «Ты ні на што не здатны» і да т. п. Часам бацькі падкрэсліваюць, што нашчадак не апраўдвае ўскладзеных на яго чаканняў, не адпавядае высокім бацькоўскім патрабаванням. «У нашай сям'і ўсе былі таленавітымі, а ты незразумела ў каго ўрадзіўся» ці «Ты відавочна ў тату-дэбіла пайшла. Гены пальцам не раздушыш!» Дзеці, якія жывуць пад такім «прэсінгам», звычайна вырастаюць з сіндромам ахвяр. Ім з юнага ўзросту не хапае ўнутранай энергіі, у іх зніжана матывацыя, няма жадання чагосьці дасягаць. Для іх норма — дэпрэсіўны стан. Пасля ў любой сітуацыі, за спінай самых розных людзей яны будуць адчуваць нябачную прысутнасць сваіх крыўдзіцеляў і неўсвядомлена імкнуцца давесці ім уласную перавагу, сваю паспяховасць, «выцерці» ім нос. У гэтай бітве з «ценямі з мінулага» ёсць вельмі вялікія шанцы поўнасцю выгарэць, захварэць.

***— Дастаткова распаўсюджана сітуацыя, калі бацькі забяспечваюць, кормяць і апранаюць сваіх нашчадкаў. Але ў іх ніколі не знаходзіцца для іх часу, каб выслухаць, абняць, прылашчыць, пацікавіцца іх поспехамі і няўдачамі. Як у анекдоце: «У дзяцінстве я думаў, што мяне клічуць «Адчапіся».***

— Мы недаацэньваем тое зло, якое прычыняе грэбаванне ў адносінах да дзяцей. Нават калі ўсе фізіялагічныя патрэбы дзіцяці задаволены, яно можа адчуваць каласальны эмацыянальны голад і абавязкова будзе шукаць, як яго наталіць. Успамінаю сваю кліентку. У жанчыны — другі шлюб, муж маладзейшы за яе, і яна прыкладае ўсе намаганні, каб утрымаць яго. Уся яе энергія, думкі засяроджаны на новым спадарожніку жыцця. На дачку ад першага шлюбу і раней не знаходзілася часу і сіл, а зараз тым больш. Дзяўчынка-падлетак замкнёная, сяброў у яе няма, яна дні напралёт вучыцца, у яе пачаўся нейрадэрміт. І гэта тыповая карціна для дзяцей з падобных сем'яў, дзе бацькі паглынутыя сваім жыццём, а іх сыны і дочкі востра адчуваюць варожасць свету, хаваюцца ад яго ў сваю шкарлупіну, моўчкі пакутуюць, спрабуюць хоць у нечым знайсці для сябе апору.

**«Гвалт як стыль выхавання ўласцівы, як правіла, асацыяльным сем'ям, сама атмасфера якіх насычана канфліктнасцю, нервовасцю, страхамі. Дзеці там рана сталеюць».**

***— Нароўні з халоднасцю і абыякавасцю траўміруе і іншая крайнасць — гіперапека. У чым яе небяспека?***

— Закамплексаванасць, няўпэўненасць, безыніцыятыўнасць, эгаістычнасць — вось да чаго прыводзіць жаданне бацькоў засцерагчы сваё дзіця ад цяжкасцяў, намаганняў, барацьбы. Гіперапека — гэта ўдушлівая (як правіла, матчына) любоў, якая прыводзіць да сацыяльнай інваліднасці, нездольнасці жыць у грамадстве з яго праблемамі, трывогамі, выклікамі. Мужчыны і жанчыны, якія выраслі ў такіх сем'ях, звычайна адрозніваюцца стараннасцю, але пазбаўлены ўсякіх амбіцый. Вельмі часта ім цяжка пабудаваць і захаваць сям'ю, многія асуджаныя на адзіноту.

***— Зразумела, што можна прыводзіць яшчэ шмат прыкладаў з рэальнага жыцця, здольных глыбока траўміраваць. Але чаму ж часам у асацыяльных сем'ях, дзе здавалася б, траўмы наносяцца ледзь не штодня, вырастаюць добрыя дзеці — самастойныя, мэтанакіраваныя, чуллівыя? Чаму іншы раз «ад асінкі нараджаюцца апельсінкі»? Як растлумачыць феномен такіх дзяцей?***

— Нармальныя, годныя дзеці вырастаюць звычайна ў здаровых сем'ях, дзе бацькі прытрымліваюцца правільнага стылю выхавання, дзе ёсць баланс дабрыні і строгасці, свабоды і кантролю, дзе дзяцей вучаць жыць камфортна і шчасліва, атрымліваць задавальненне, дасягаць сваіх мэт, не наносячы шкоды, непрыемнасцяў іншым людзям. Такія дзеці вылучаюцца яшчэ і моцным біялагічным патэнцыялам. Калі біялагічна моцнае дзіця нараджаецца ў сям'і, дзе п'е бацька, а мама знаходзіць сілы сысці з малым жыць асобна, то шанц не паўтарыць лёс бацькі вельмі вялікі. Калі ж біялагічна моцныя дзеці фарміруюцца ў маргінальнай абстаноўцы, дзе абодва бацькі п'юць, не займаюцца іх развіццём, то яны, хутчэй за ўсё, будуць весці асацыяльны лад жыцця. Годнымі людзьмі яны могуць вырасці ў тых выпадках, калі ў іх асяроддзі знойдуцца дарослыя, якія падтрымаюць іх, падставяць плячо, накіруюць, натхняць, дапамогуць знайсці сябе і сваё месца.

***— Ці можна, стаўшы дарослым, абараніць сябе ад наступстваў псіхалагічных траўм? Якой стратэгіі, якой пазіцыі, Таццяна Міхайлаўна, трэба прытрымлівацца, каб выйсці пераможцам у барацьбе са сваім траўматычным багажом, не даць мінуламу магчымасці перакрэсліць сваю сучаснасць і будучыню?***

— Каб пераадолець траўмы, чалавек павінен быць матываваны рухацца наперад, расці, удасканальвацца. Пачынаецца гэты працэс з самааналізу, а потым выпрацоўваецца стратэгія па разбурэнні старой і стварэнні новай мадэлі паводзін, новага жыццёвага сцэнарыю. На жаль, да гэтага чалавека часта падштурхоўваюць драмы і трагедыі. Лепш, безумоўна, іх не чакаць, а дзейнічаць на апярэджанне. Калі дарослыя людзі на прыёме слёзна скардзяцца на пражытыя ў дзяцінстве траўмы, апраўдваюць свае няўдачы памылкамі, крыўдамі з боку бацькоў — гэта паказвае іх інфантылізм. Моцныя асобы самастойна або звяртаючыся да дапамогі спецыялістаў прапрацоўваюць свае траўмы і пазбаўляюцца ад дзіцячых крыўд і прэтэнзій як ад хламу, а не размахваюць імі ўвесь час як сцягам, апраўдваючы сваю бяздзейнасць, бязвольнасць і слабасць. Трэба памятаць: дзе канцэнтрацыя нашай увагі, там і энергія. Калі не засяроджвацца на мінулых няўдачах і нешанцаванні, то не будзе і праблем з-за гэтага.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**

# ІДЭАЛЬНАЯ ФОРМА

## Ці можа скальпель зрабіць постаць больш вытанчанай?

**ЛІПАСАКЦЫЯ — пластычная аперацыя па выдаленні тлушчавай тканіны — хвалюе ўяўленне прыгожай паловы чалавецтва не адно дзесяцігоддзе. Атрымаць жаданую ўдарлявасць і вытанчанасць на хірургічным стале, заснуць звычайнай, сярэднестатыстычнай, а прачнуцца — багіняй... Скальпель хірурга замест чароўнай палачкі феі! Прыкладна так уяўляюць сабе ліпасакцыю тыя, хто не вывучаў пытанне.**

Нічога не зробіш: тэхналогіі развіваюцца, жыццё з году ў год становіцца больш камфортным. Як вынік, велізарная колькасць сучасных людзей — хай не пакрыўдзяцца аматары спорту і здаровага ладу жыцця, не пра іх гаворка — рухаецца ўсё менш (штодзённую ранішнюю і вячэрнюю перасадку з-за кухоннага/працоўнага стала ў вадзіцельскае крэсла аўтамабіля ўлічваць не варта), а сілкуецца ўсё больш каларыйна (фастфуд і рафінаваныя прадукты не праходзяць бясследна для постаці і здароўя). Гэта як з глабальным пацяпленнем. Льды ў Антарктыдзе быццам бы растаюць, а ў нас увесь ліпень холадна і дажджы, і калі адпачынак у вас быў якраз у ліпені і праводзілі вы яго не выязджаючы за мяжу, то, напэўна, задаваліся пытаннем: ну і дзе ж тое пацяпленне, калі не глабальнае, дык хоць бы лакальнае? Тое ж самае з харчовай бяспекай: мы чытаем у навінах аб перспектыве сусветнага харчовага крызісу, але пакуль што тлустае і каларыйнае купіць у абедзенны перапынак прасцей, чым посны салацік з рукалы. Словам, мы таўсцеем — як, дарэчы, і жыхары іншых еўрапейскіх краін. І нават тыя, хто не плануе звяртацца да хірургічнага спосабу здабывання жаданых формаў (а такіх, на шчасце, большасць), усё ж не-не ды і паразважаюць аб такой магчымасці... Ну, а мы, адкінуўшы лірыку, вырашылі высветліць, якую цану (у выглядзе рызык, абмежаванняў і, магчыма, неапраўданых чаканняў) прыйдзецца заплаціць за «лепшую версію сябе» тым, хто ўсё ж такі на гэта адважыўся.

### ПРЫГАЖОСЦЬ ПАТРАБУЕ АХВЯР?

Пачнём з таго, што ліпасакцыя — гэта пластычная аперацыя, якая прадугледжвае хірургічнае выдаленне тлушчавай тканіны праз невялікія праколы скуры (дыяметрам ад 2-3 да 5-6 мм у залежнасці ад зоны, дзе выдаляюць тлушч), тлумачыць **пластычны хірург Марына ГУРЫК**. На пачатку сваёй гісторыі ліпасакцыя была досыць траўматычнай, і пацыент рызыкаваў здароўем у імя прыгажосці. Першыя ліпасакцыі выконваліся прынцыпова іншымі інструментамі ў параўнанні з сучаснымі (першапачаткова — пры дапамозе кюрэтак: гэты інструмент нагадвае вострую пятлю), і рызыкі пацыента абумоўліваліся вялікай стратай крыві і тым, што ўрач не мог кантраляваць працэс аспірацыі тлушчу. Падчас такіх аперацый — у пачатку гісторыі ліпасакцыі — пашкоджваліся валокны злучальнай тканкі і, адпаведна, сасуды (тлушчавая тканка вельмі добра забяспечваецца крывёй). Пазней ліпасакцыю навучыліся выконваць пры дапамозе канюль (доўгіх трубак, кончык якіх закруглены). Рэвалюцыяй у гэтым пытанні стала стварэнне малатраўматычных інструментаў, а таксама вынаходніцтва раствору Кляйна, які, з аднаго боку, абязбольвае, а з другога — звужае сасуды, і хірургічнае ўмяшанне адбываецца практычна без кровастраты. Пранікаючы ў тканкі, сучасны інструмент хірурга аказвае мінімальнае разбуральнае ўздзеянне на сасуды. Як вынік — сёння гэтая аперацыя стала дастаткова бяспечнай, адзначае спецыяліст.

І ўсё ж аперацыя ёсць аперацыя. Акрамя таго, тлушчавая тканка, як сцвярджаюць медыкі, на самай справе адна з найвялікшых каштоўнасцяў нашага арганізма. Бо складаецца яна не толькі з тлушчавых клетак. Гэта яшчэ і імунныя, і ствалавыя клеткі, і папярэднікі тлушчавых клетак

прэадзіпацыты: калі мы спажываем залішнюю колькасць калорый, якраз яны і ператвараюцца ў тлушч. Калісьці фізіёлагі лічылі, што функцыя тлушчавай тканкі — толькі ў тым, каб назапашваць тлушч і расшчапляць яго пры недахопе энергіі. Сучасная медыцына ведае, што тлушчавая тканка метабалічна актыўная: з'яўляецца важным удзельнікам абмену рэчываў, прымае ўдзел у гарманальнай рэгуляцыі і ў цэлым у многіх працэсах, якія наўпрост уплываюць на наша здароўе і самаадчуванне. Акрамя таго, тлушч — гэта маладосць, сцвярджаюць пластычныя хірургі. Дык ці трэба яго выдаляць хірургічным шляхам?

Зрэшты, сёння людзі сталі радзей звяртацца да ліпасакцыі з мэтай знізіць масу цела, тлумачыць суразмоўца. Справа і ў арыентаванасці на здаровы лад жыцця, якая ўвайшла, нарэшце, у звычку ў нашай краіне. І, так бы мовіць, у модзе на бодзіпазітыў.

— У грамадстве расце медыцынская адукаванасць і людзі разумеюць, што прызначэнне ліпасакцыі — карэкцыя контураў цела, — кажа суразмоўніца. — Акрамя таго, сёння людзі сталі часцей хадзіць у трэнажорныя залы, басейны, імкнуцца больш правільна харчавацца. І гэта вельмі радуе.

***— А як вы ставіцеся да паняцця «бодзіпазітыў» — то-бок да імкнення прыняць і палюбіць сябе «як ёсць»?***

— У цэлым, падтрымліваю — з псіхалагічнага пункту гледжання правільна камфортна адчуваць сябе ў сваім целе пры любых яго памерах і габарытах, а таксама

### СЕМ РАЗОЎ АДМЕРАЙ...

Калі вы думаеце, што мэта ліпасакцыі — знiжэнне масы цела, вы падтрымліваеце распаўсюджаную памылку. Мэта гэтай аперацыі — карэкцыя контураў цела, а не знiжэнне масы. Яе прызначэнне — ухіленне лакальных залішніх адкладанняў тлушчу ў пэўных месцах. Гэта, напрыклад, так званыя «галіфэ» — адкладанні тлушчу ў верхняй траціне сцягна па вонкавай паверхні. «Галіфэ» візуальна робяць ногі карацейшымі і скажаюць іх форму. Пазбаўляемся ад гэтых адкладанняў, і ногі зрокава становяцца даўжэйшымі, а іх форма — больш прывабнай. Таксама з дапамогай ліпасакцыі можна прыбраць тлушчавыя адкладанні паміж плячом і грудзьмі, так званыя «крылцы». Або «фартух» унізе жывата, ці бакі, якія вісяць над поясам і робяць постаць квадратнай. Атрымліваем прыгожы контур фігуры. Але вось што датычыцца знiжэння вагі, то за адзін раз бяспечным лічыцца выдаленне тлушчу ў колькасці 5 % ад масы цела. То-бок калі чалавек важыць 80 кілаграм, то гэта ўсяго каля 4-5 кг. Максімальны аб'ём тлушчу, які можна выдаліць адначасова без сур'ёзных праблем са здароўем — не больш за 10 %.

Ці можна схуднець з дапамогай скальпеля пластычнага хірурга? Тут варта разумець: пры лішку масы цела тлушч запасіцца не толькі пад скурай. Напрыклад, у жанчыны жывот можа быць вялікім ад перарасцяжэння апанеўрозу пасля цяжарнасці. Маладая мама фанатычна качае прэс, і калі прычына жывоціка — расцяжэнне мышцаў, то атрымлівае жаданы вынік. Але калі прычына ў расцяжэнні апанеўрозу, то, нягледзячы на ўсе намаганні, жывоцік не сыдзе: гэтая тканка не здольная да скарачэння. Тое ж самае датычыцца жывата ў мужчын: у моцнай паловы тлушч назапашваецца ў большай ступені не пад скурай жывата, а ўнутры, тлумачыць спецыяліст. Кішэчнік у чалавека акружаны тлушчавай тканкай, і калі тлушчу вакол кішэчніка шмат, нават прыбраўшы частку падскурнага тлушчу, значна больш худым чалавек не стане.

— Гэта асабліва важна данесці да пацыента да аперацыі, каб не было расчаравання, — кажа суразмоўніца. — Калі трэба знізіць масу цела, існуюць аперацыі на страўніку, кішэчніку. А ў цэлым, па маім глыбокім перакананні, лепш знiжаць масу цела натуральным шляхам. Аддавайце перавагу правільнаму харчаванню і выконвайце пітны рэжым, займайцеся здаровай і разумнай фізічнай актыўнасцю, і паступова ваша фігура наблізіцца да ідэалу, які вы намецілі.

Дарэчы, нерэалістычныя чаканні пацыента — адно з безумоўных супрацьпаказанняў да ліпасакцыі для большасці пластычных хірургаў (наогул, гэта супрацьпаказанне і для іншых пластычных аперацый). Акрамя таго, у ліпасакцыі ёсць мноства іншых супрацьпаказанняў. Перш за ўсё агульныя хірургічныя: інфекцыйныя і запаленчыя захворванні.

Зразумела, ліпасакцыя, як і ў цэлым пластычная хірургія, у першую чаргу «працуе» на прыгожую палову чалавецтва. Але і мужчыны часам рашаюцца на гэтую аперацыю. Дарэчы, існуе не толькі ліпасакцыя цела, але і, напрыклад, шыі — выдаляецца «другі падбародак». Часам гэта аперацыя выконваецца і на тварах — цяпер папулярна паняцце «ліпаскульптура». Па меры старэння апускаюцца тканкі твару — мы ўсё гэта, на жаль, ведаем, прычым на ўласным досведзе. Але таксама пераразмяркоўваецца і тлушчавая тканка на тварах. Хірург, нібы скульптар, мадэлюе твар, памяншаючы аб'ём адных тлушчавых пакетаў і павялічваючы аб'ём іншых. Пры ліпаскульптуры з адной часткі твару прыбіраецца тлушчавая тканка, а ў іншых частках вырабляецца ліпафілінг, распавядае спецыяліст. У выніку твар выглядае нашмат маладзейшым.

Дададзім, што аперацыя (нават калі гаворка аб невялікіх зонах) патрабуе працяглага аднаўлення: так, у прыватнасці, прыйдзецца насіць спецыяльную кампрэсійную постаперацыйную бялізну на працягу 1-2 месяцаў, а часам і даўжэй (летам у такой будзе горача, таму ліпасакцыі часцей праводзяцца зімой). Не кажучы ўжо пра тое, што ўкласці ў гэты метад карэкцыі фігуры прыйдзецца немалыя сродкі, якіх з лішкам хопіць, напрыклад, на гадавы абанемент у трэнажорную залу і ў басейн. І тут мы зноў вяртаемся да думкі, што спорт і здаровае харчаванне наўрад ці варта спрабаваць замяніць пластычнай аперацыяй, як бы ні развівалася медыцына і якімі б інавацыйнымі тэхналогіямі не магла пахваліцца.

**Дзіяна РОНІНА.**

## Смехатэрапія

# Усё па справядлівасці

*15 гадоў: выскоквае сэрца, калі кахаеш. 75 гадоў: выскоквае калена, калі чхаеш.*

***

*Хто не працуе,*
*той удала выйшаў замуж!*

***

*Я і рада была б страціць ад кахання галаву. Але яна ў мяне намёртва прыбіта мінулым вопытам.*

***

*Калі вы баяцеся распаўнець, выпейце перад прыняццем ежы 50 грамаў каньяку. Ён прытупляе пачуццё страху.*

***

*У сям'і павінна быць усё па справядлівасці: тата працуе, а мама — прыгожая.*

***

*Калі пасля сваркі жонка нечакана ўсё вам даравала, значыць яна ўжо прыдумала вытанчаны спосаб помсты.*

***

*Сямейныя абавязкі падобныя да музыкі —*
*іх пастаянна выконваюць!*

***

*Кожны муж незадаволены тым, як трацяць грошы яго жонка і кіраўніцтва. Розніца ў тым, што ён не баіцца адкрыта крытыкаваць кіраўніцтва.*

***

*Жонка — гэта чалавек, які дапамагае мужу пераадольваць перашкоды, каторых ён і не ведаў бы, калі б не ажаніўся.*

***

*Зброя павінна захоўвацца ў чахле. Таму жанчыны і носяць бюстгалтары.*

***

*Сустрэць жанчыну сваёй мары не складана.*
*Складана яе ад жонкі схаваць...*

***

*Да жаніцьбы муж і не падазраваў, што можна няправільна паставіць малако ў халадзільнік.*

***

*Раней у мяне ўсё валялася на сваіх месцах. Завёў жонку. Цяпер усё акуратна складзена бог ведае дзе...*

***

*Кажу мужу: давай купім машыну, я вадзіць навучуся, свет паглядзім! Ён перапытвае: той ці гэты?*

***

*Вырашыла зрабіць мужчынскую работу па доме: легла на канапу, гляджу тэлевізар. Цяжка, не спрачаюся, але трэба.*

***

*Кожнаму мужчыну, які купіў на 8 Сакавіка патэльню, — каска ў падарунак!*

***

*Дарагі, паглядзела на тваю палюбоўніцу і вырашыла: гэта не здрада, гэта подзвіг!*

***

*Чужы муж, калі п'яны, такі вясёлы і цікавы! А свой — ну дурань дурнем.*

***

*Толькі таты ўмеюць надзець дзіцяці калготкі так, каб дзве палосачкі былі спераду, але пры гэтым пятачкі знаходзіліся абсалютна на сваім месцы.*

***

*Адзіны чалавек, для якога ты заўсёды худая, — гэта твая бабуля.*

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении **09 октября 2023 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| **Предмет торгов** |
|---|
| Капитальное строение с инв. номером 630/С-47149 общей площадью 647,0 кв. м (наименование – административное здание; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: бетонный подвал); капитальное строение с инв. номером 630/С-47154 общей площадью 397,2 кв. м (наименование – склад материальный; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47152 общей площадью 222,7 кв. м (наименование – склад для горюче-смазочных материалов; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47155 общей площадью 743,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47160 общей площадью 1960,9 кв. м (наименование – ремонтные мастерские; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47158 общей площадью 1360,7 кв. м (наименование – пристройка к реммастерским; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47156 общей площадью 1123,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-55558 общей площадью 35,0 кв. м (наименование – навес под баллоны; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-55622 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из силикатного кирпича (1,95 м х 2,34 м х 0,25 м), площадью 4,6 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55620 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из металлической арматуры (21,0 м х 2,69 м), площадью 56,5 кв. м, на металлических столбах (0,1 м х 2,60 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55611 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1.1. – ограждение из силикатного кирпича (13,94 м х 2,85 м х 0,25 м), 39,7 кв. м, а1.2. – ворота металлические (4,07 м х 2,85 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55610 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение бетонное (97,5 м х 1,71 м), 166,7 кв. м с 31 кирпичными столбиками с бетонными оголовками; а.1.1. – металлическая решетка (1,50 м х 1,97 м), 41,37 кв. м; а2 – ворота металлические (5,96 м х 3,70 м), 22,1 кв. м; а2.1. – калитка металлическая (1,62 м х 2,30 м), 3,73 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55608 общей площадью 7260,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из асфальтобетона); капитальное строение с инв. номером 630/С-55607 общей площадью 465,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из бетонной плитки); оборудование котельной с инв. номером 146 (котел КВЖ-02, 2 шт.; циркуляционный насос, 4 шт.; бойлер 10 куб. м, 1 шт.; топливопровод 20 м; щит управления) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,331 га, кадастровый номер – 642000000002000230 |
| Местонахождение: Минская область, Минский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33 |
| Начальная цена: 1 363 662,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 136 000,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **09 октября 2023 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 15.09.2023 по 05.10.2023 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона и оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Продавец** | ООО «Баньян», Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Коссово, ул. 3-го февраля, 7. УНП 291305711 |

**Предмет электронного аукциона**

**Помещение № 2**

(**торговое помещение**, общ. пл. **285,4 кв. м**, инв. № 612/D-30579).
**Адрес: Минская обл., г. Жодино, ул. Московская, 30-2**

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 277 560,00 бел. руб.** (снижена на 10 %)

Обременение: помещение сдано в аренду

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 3 % от цены продажи предмета электронных торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.08.2023 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 28.09.2023 в 13.00. Окончание торгов: 28.09.2023 в 14.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.09.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 (17) 280 36 37; +375 (44) 704 92 06, info@ipmtorgi.by**

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОАО «Берестовицкая ПМК № 141»** (УНП 500020631), объявляет о проведении **26.09.2023 г.** с 9.00 до 16.00 электронных торгов в форме аукциона.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

## 23.10.2023 года в 11.00 Светлогорский районный исполнительный комитет

**проводит открытый аукцион по продаже** не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома готовностью 12 %, расположенного по адресу: г. Светлогорск, ул. Каштановая, 139, на земельном участке с кадастровым номером 325050100001010195 площадью 0,1517 га и права аренды земельного участка сроком на 50 лет (аукцион состоится в зале заседаний райисполкома по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, д. 1 (2-й этаж)

